ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 17 (4269)
Чацьвер 21 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Ленінізм перамагае. ЛЕНІН—Пачатак рэвалюцыі ў Расіі (1 стар.). І. СТАЛІН—Прамова на вечары крэмлёўскіх курсантаў (2 стар.). А. ЕНУКІДЗЭ—Савецкая дзяржава 8 год бяз Леніна (1 стар.). В. ШАРАНГОВІЧ—Напярэдадні XIV зьезду КП(б)Б (2 і 3 стар.).
Справаздача менскага гаркому КП(б)Б—з дакладу тав. КАВАЛЬЧУКА на 2-й Менскай гарадзкой партканфэрэнцыі. Ленінскія дні адзначым узмацненьнем збожжазагатовак, поўным выкананьнем плянаў (4 стар.).
Калгасы «Іскра рэвалюцыі», «Чырвоны молат» па-бальшавіцку змагаюцца за выкананьне плянаў ільназагатовак (4 стар.).
Хваля белага тэрору коціцца па ўсёй Польшчы (4 стар.).

Бяз Леніна,—па ленінскім шляху, высока трымаючы сьцяг ленінізму, бальшавіцкая партыя пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК і лепшага ленінца—тав. Сталіна, вядучы непрымірымае змаганьне на два фронты, атрымала перамогі сусьветна-гістарычнага значэньня ў будаўніцтве сацыялізму

ЛЕНІНІЗМ ПЕРАМАГАЕ

8 ГОД. 8 год упартай барацьбы бяз Леніна, за ленінізм у тэорыі і на практыцы. 8 год, прынёсшых найвялікшыя перамогі сацыялізму, заваяваныя партыяй са сьцягам Леніна ў руках, у непрымірымай барацьбе супроць апартуністаў — штрэйкбрэхэраў пралетарскай рэвалюцыі. 8 год, пераможна пройдзеных пралетарыятам вялікай савецкай краіны, пад кіраўніцтвам партыі па шляху, указаным Ільлічом.

Ідучы гэтым шляхам, мы ўступілі ў пэрыяд сацыялізму, завяршылі пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі і пераможна ажыцьцяўляем пяцігодку за чатыры гады.

Ідучы гэтым шляхам, мы ўступілі ў разбуранай і адсталай прамысловасьці да магутнай сацыялістычнай індустрыі, узброенай перадавой тэхнікай, да індустрыі, якая ўжо даўно ў некалькі раз перавысіла даваенны ўзровень і расьце з дня ў дзень гігацкімі тэмпамі, да ўласнага вырабу сродкаў вытворчасьці.

Ідучы гэтым шляхам мы прыйшлі ад дробнай сялянскай гаспадаркі, якая «нараджае капіталізм і буржуазію пастаянна, штодзенна, штогадзінна, стыхійна і ў масавым маштабе» (Ленін), да пасьпяховага ажыцьцяўленьня надзвычайнай суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове апошняй эксплёататарскай клясы ў нашай краіне — кулацтва.

10 год назад у сваіх «Заметках публициста» Ленін пісаў: «Мы стварылі савецкі тып дзяржавы, пачалі гэтым сусьветна-гістарычную эпоху, эпоху палітычнага панаваньня пралетарыяту, прышоўшую на зьмену эпохі панаваньня буржуазіі... Але мы недарабілі нават фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Гэта яшчэ могуць адабраць назад варожыя нам сілы паміраючага капіталізму». І Ленін з усім запалам і жалезнай энэргіяй найвялікшага рэвалюцыянэра заклікаў партыю і пралетарыят у мінімальны тэрмін з «найменшымі памылкамі» і «адступленьнямі» завяршыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі, стварыць і няўхільна ўзмацняць адзіную базу сацыялізму — буйную індустрыю.

Ленінскі плян электрыфікацыі зьявіўся геніяльнай праграмай для ўсёй барацьбы нашай партыі за перамогу будаўніцтва сацыялізму. Ён, як гіганцкі пражэктар, асьвятліў шляхі ажыцьцяўленьня і сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і яшчэ больш узброіў усю партыю, усю рабочую клясу рэвалюцыйным энтузіязмам, энэргіяй і верай у перамогу. Ленін з усёй сілай падкрэсьліў, што толькі «тады, калі наша краіна будзе электрыфікавана, калі пад прамысловасьць, сельскую гаспадарку і транспарт будзе падведзена тэхнічная база сучаснай буйной прамысловасьці, толькі тады мы пераможам канчаткова».

Якавы рэзультаты 8 год будаўніцтва сацыялізму бяз Леніна? У 1924 г. наша мэталюргія дасягнула толькі 10-15 проц. даваеннага ўзроўню, а здабыча вугалю — 50. Тады мы яшчэ знаходзіліся на вялікай адлегласьці ад завяршэньня адбудоўчага пэрыяду. Арганізацыя новай вытворчасьці толькі нараджалася. А цяпер?

Партыя і яе ЦК на чале з лепшым ленінцам тав. Сталіным забясьпечылі перавыкананьне праграмы першых трох год «вялікага пляну работ». Ажыцьцяўлены запаветы мары Леніна — пралетарыят Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, пераможна пабудаваў фундамант сацыялістычнай эканомікі. Асноўная база сацыялізму — буйная індустрыя — няўхільна расьце і мацнее. Даваенныя паказальнікі далёка пакінуты ззаду. Цяжкая індустрыя БССР, як і ўся прамысловасьць, узяла такія тэмпы свайго росту, аб якіх капіталізм і ня сьніў нават у самыя лепшыя дні свайго існаваньня. Даволі ўказаць, што толькі адна прамысловасьць БССР у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі вырасла на 69 проц.

Адзін за адным уступаюць у строй сусьветныя гіганты сацыялістычнай індустрыі. Вырасьлі і працуюць поўным ходам найвялікшыя трактарныя заводы, даўшыя ўжо тыя дзесяткі тысяч трактароў, якія канчаткова перакапалі серадніка сказаць, што ён «за калгасы». Пад кіраўніцтвам партыі мы авалодалі вытворчасьцю новых складанейшых машын, апярэдзіўшы ўжо капіталістычныя краіны ў тэхнічных адносінах па некаторых галінах прамысловасьці. Чацьверты, заключны год пяцігодкі прынясе далейшае, яшчэ больш рашучае вызваленьне СССР ад замежнай тэхніч-эканамічнай залежнасьці і новыя рашаючыя перамогі ў выкананьні лёзунгу «дагнаць і перагнаць!»

Ленінскае пытаньне «хто-каго» наша партыя вырашыла ня толькі ў прамысловасьці, але і ў сельскай гаспадарцы. Цяпер ужо ня дробны індывідуальны сэктар дамінуе ў сельскай гаспадарцы. Цяпер абсалютную перавагу ў сельска-гаспадарчай эканоміцы заваяваў сацыялістычны сэктар — саўгасы і калгасы. У рашаючых збожжавых раёнах Савецкага Саюзу суцэльная калектывізацыя ў асноўным завершана. Цэнтральнай фігурай зямляробства стала калгаснае сялянства.

Партыя па-бальшавіцку ажыцьцяўляе ленінскі плян электрыфікацыі. «Лямпка Ільліча» ўжо запалена ў тысячах саўгасаў і калгасаў, вёсках і сельсаветах. Ленінскі маяк сацыялізму прабіваецца ў самыя глухія куткі нашай краіны.

Мы дабіліся найвялікшых посьпехаў і ў разгортваньні культурнай рэвалюцыі, у выкананьні запавету Леніна аб ліквідацыі няпісьменнасьці. Вырасьлі і няўхільна растуць рады рабочай клясы. Узрастае з кожным днём дабрабыт найшырэйшых рабочых мас і ўсіх працоўных.

Наша партыя заваявала гэтыя гіганцкія перамогі ў баёх супроць усякіх ухілаў ад сваёй генэральнай лініі і прымірэнцтва да іх, высока трымаючы сьцяг ленінізму. Ленін заўсёды ўпарта змагаўся за адзінства і маналітнасьць радоў нашай партыі. Па ініцыятыве Леніна яшчэ на Х-м зьезьдзе РКП(б) была прынята пастанова аб забароне ўсякіх фракцый і групоўвак у радох партыі. Наша партыя, ні на крок не адступаючы ад пастаноў Х зьезду, цьвёрда і непахісна захоўвае ленінскія запаветы аб ідэйным і арганізацыйным адзінстве сваіх радоў. І іменна толькі таму мы атрымалі буйнейшыя перамогі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Партыя разграміла трацкізм, які стаў перадавым атрадам контр-рэвалюцыі, вяла і вядзе непрымірымую барацьбу супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі і «левых» загібшчыкаў.

Ленінская непрымірымасьць бальшавізму перамагла. Да 8-ай гадавіны з дня сьмерці свайго правадыра партыя Леніна прыйшла спаяным, маналітным атрадам, згуртаваным вакол Цэнтральнага Камітэту і тав. Сталіна. У рады партыі ўступілі сотні тысяч лепшых пралетараў і ўдарнікаў калгаснага будаўніцтва. Узбройваючы партыйныя масы тэорыяй марксызму-ленінізму, мы павінны яшчэ больш павысіць бальшавіцкую пільнасьць, каб і надалей даваць сваячасовы і зьнішчальны адпор усякім праяўленьням трацкісцкай кантрабанды і гнілога лібэралізму.

Перамогі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР — перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі. Наша партыя няўхільна ажыцьцяўляе ленінскую нацпалітыку, непрымірыма змагаючыся супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як найбольш небясьпечнага на даным этапе, супроць усіх і ўсякіх ухілаў у нацыянальным пытаньні.

Савецкі Саюз і яго фарпост —БССР, завяршыўшы фундамант сацыялістычнай эканомікі, ідуць пад кіраўніцтвам партыі да пераможнага ажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры гады. Рабочыя і калгасныя масы краіны Саветаў адзначаць ленінскія дні яшчэ большай мабілізацыяй усіх сваіх сіл на барацьбу за праграму заключнага году пяцігодкі на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна.

Капіталістычны сьвет, ахоплены найвялікшым эканамічным крызісам, шпарка ідзе па шляху далейшага развалу, да катастрофы.

Усё мацней і мацней закругляецца пятля крызісу, наперакор бясплённым стараньням сацыял-фашысцкіх лекараў капіталізму вылечыць свайго безнадзейна захварэўшага пацыэнта.

Камуністычныя партыі мабілізуюць міжнародны пралетарыят на барацьбу за рэвалюцыйны выхад з эканамічнага крызісу, за абарону краіны дыктатуры пралетарыяту.

Пад сьцягам ленінізму пралетарская рэвалюцыя ПЕРАМАГЛА НА АДНЭЙ ШОСТАЙ ЧАСТЦЫ ЗЕМНАЙ КУЛІ. ПАД СЬЦЯГАМ ЛЕНІНІЗМУ ЯНА ПЕРАМОЖА І ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ ДЭЛЕГАТАЎ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б.

Выдача мандатаў праводзіцца У КАНТОРЫ II САВЕЦКАЙ ГАСЬЦІНІЦЫ на Камсамольскай вул., д. № 36/66, рог. Савецкай (уваход з Камсамольскай вул), пачынаючы з 21 студзеня ў 10 гадз. раніцы да 3 гадз. дня штодзенна.

АРГ. КАМІСІЯ



ЛЕНІН

Пачатак рэвалюцыі ў Расіі*)

Жэнэва, серада 25 (12) студзеня.

Найвялікшыя гістарычныя падзеі адбываюцца ў Расіі. Пралетарыят паўстаў супроць царызму. Пралетарыят быў давэдзен да паўстаньня ўрадам. Цяпер наўрад ці магчымы сумненьні ў тым, што ўрад наўмысна даваў параўнальна бесьперашкодна разьвівацца стачачнаму руху і пачацца шырокай дэманстрацыі, жадаючы давесьці справу да прыстасаваньня ваеннай сілы. І ён давёў да гэтага! Тысячы забітых і параненых—такавы вынікі «Крывавай нядзелі» 22 (9) студзеня ў Пецярбургу. Войска перамагло безбройных рабочых, жанчын і дзяцей. Войска адужала непрыяцеля, расстрэльваючы ляжаўшых на зямлі рабочых. «Мы далі ім добры ўрок»! З невыказным цынізмам гавораць цяпер царскія служкі і іх эўрапэйскія лёкаі з кансэрватыўнай буржуазіі.

Так, урок быў вялікі! Рускі пралетарыят не забудзе гэтага ўроку. Самыя непадрыхтаваныя, самыя адсталыя пласты рабочай клясы, наіўна верыўшыя ў цара і шчыра жадаўшыя мірна перадаць «самому цару» просьбы змучанага народу, усе яны атрымалі ўрок ад ваеннай сілы, якою кіраваў цар або дзядзька цара, вялікі князь Уладзімер.

Рабочая кляса атрымала вялікі ўрок грамадзянскай вайны; рэвалюцыйнае выхаваньне пралетарыяту за адзін дзень пайшло наперад так, як яно не магло-б пайсьці ў месяцы і гады шэрага, будзённага, забітага жыцьця. Лёзунг геройскага пецярбурскага пралетарыяту: «сьмерць або свабода!» рэхам пранесіцца цяпер па ўсёй Расіі. Падзеі разьвіваюцца з нязвычайнай шпаркасьцю. Усеагульная стачка ў Пецярбургу расьце. Усё прамысловае, грамадзкае і палітычнае жыцьцё паралізавана. У панядзелак 23 (10) студзеня сутычкі рабочых з войскам становяцца больш жорсткімі. Наперакор ілжывым урадавым паведамленьням, кроў льлецца ва многіх і многіх частках сталіцы. Узьнімаюцца рабочыя Колпіна. Пралетарыят узбройваецца і ўзбройвае народ. Рабочыя захвацілі, кажуць, Сестрарэцкі склад зброі. Рабочыя запасаюцца рэвальвэрамі, выкоўваюць сабе зброю са сваіх інструмантаў, здабываюць бомбы для бязьлітаснага змаганьня за свабоду. Усеагульная стачка ахапляе правінцыі. У Маскве 10 тыс. чал. ужо кінулі работу. На заўтра (чацьвер 26 (13) студзеня) назначана ўсеагульная стачка ў Маскве. Выбухнуў мяцеж у Рызе. Маніфестуюць рабочыя ў Лодзі, рыхтуецца паўстаньне Варшавы, адбываюцца дэманстрацыі пралетарыяту ў Гельсінгфорсе. У Баку, Адэсе, Кіеве, Харкаве, Коўні і Вільні расьце хваляваньне рабочых і шырыцца забастоўка. У Сэвастопалі гараць склады і арсэнал морскага ведамства, і войска адмаўляецца страляць у паўстаўшых матросаў. Стачка ў Рэвэлі і Саратаве. Узброеная сутычка з войскам рабочых і запасных у Радаме.

Рэвалюцыя разрастаецца. Урад пачынае ўжо кідацца. Ад палітыкі крывавай рэпрэсіі ён прабуе перайсьці да эканамічных уступак і адчапіцца падачкай або абяцаньнем дзевяцігадзіннага рабочага дня. Але ўрок крывавага дня ня можа прайсьці дарма. Патрабаваньне паўстаўшых пецярбурскіх рабочых—неадкладнае скліканьне ўстаноўчага збору на аснове ўсеагульнага, простага, роўнага і тайнага выбарчага права—павінна стаць патрабаваньнем усіх бастуючых рабочых. Неадкладнае зьвяржэньне ўраду—вось лёзунг, якім адказалі на бойню 22 (9) студзеня нават верыўшыя ў цара пецярбурскія рабочыя, адказалі вуснамі іх правадыра, папа Георгія Гапона, які сказаў пасьля гэтага крывавага дня: «У нас няма больш цара. Рака крыві аддзяляе цара ад народу. Няхай жыве змаганьне за свабоду!»

Няхай жыве рэвалюцыйны пралетарыят! скажам мы. Усеагульная стачка падымае і мабілізуе ўсё больш шырокія масы рабочай клясы і гарадзкой беднаты. Узбраеньне народу становіцца адной з бліжэйшых задач рэвалюцыйнага моманту.

Толькі ўзброены народ можа быць сапраўднай апорай народнай свабоды. І чым хутчэй удасца ўзброіцца пралетарыяту, чым далей пратрымаецца ён на сваёй ваеннай пазыцыі забастоўшчыка-рэвалюцыянэра, тым хутчэй дрогне войска, тым больш знойдзецца сярод салдат людзей, якія зразумеюць, нарэшце, што яны робяць, якія стануць на бок народу супроць катаў, супроць тырана, супроць забойцаў безбройных рабочых, іх жонак і дзяцей. Як-бы ні скончылася цяперашняе паўстаньне ў самым Пецярбургу, ва ўсякім выпадку яно немінуча і няўхільна стане першай ступеньню да яшчэ больш шырокага, больш сьвядомага, больш падрыхтаванага паўстаньня. Ураду, магчыма, удасца адтэрмінаваць час расплаты, але адтэрмінаваньне толькі зробіць больш грандыёзным наступны крок рэвалюцыйнага націску. Адтэрмінаваньне толькі выкарыстае сацыял-дэмакратыя для згуртаваньня радоў арганізаваных байцоў і пашырэньня вестак аб пачынаньні пецярбурскіх рабочых. Пралетарыят будзе далучацца да змаганьня, пакідаючы фабрыкі і заводы, рыхтуючы сабе ўзбраеньне. У асяродзішча гарадзкой беднаты, у асяродзішча мільёнаў сялянства будуць шырэй і шырэй несьціся лёзунгі змаганьня за свабоду. Рэвалюцыйныя камітэты будуць засноўвацца на кожнай фабрыцы, у кожным раёне гораду, у кожным значным сяле. Паўстаўшы народ стане скідаць усе і ўсялякія ўрадавыя ўстановы царскага самаўладзтва, абвяшчаючы неадкладнае скліканьне ўстаноўчага збору.

Неадкладнае ўзбраеньне рабочых і ўсіх грамадзян наогул, падрыхтоўка і арганізацыя рэвалюцыйных сіл для зьнішчэньня ўрадавых улад і ўстаноў, вось тая практычная аснова, на якой могуць і павінны злучыцца для агульнага ўдару ўсе і ўсякія рэвалюцыянэры. Пралетарыят заўсёды павінен ісьці сваім самастойным шляхам, не аслабляючы сваёй сувязі з сацыял-дэмакратычнай партыяй, памятаючы аб сваіх вялікіх канчатковых мэтах вызваленьня ўсяго чалавецтва ад усякай эксплёатацыі. Але гэта самастойнасьць сацыял-дэмакратычнай пралетарскай партыі ніколі ня прымусіць нас забыць пра важнасьць агульнага рэвалюцыйнага націску ў момант сапраўднай рэвалюцыі. Мы, сацыял-дэмакраты, можам і павінны ісьці незалежна ад рэвалюцыянэраў буржуазнай дэмакратыі, ахоўваючы клясавую самастойнасьць пралетарыяту, але мы павінны ісьці рука аб руку ў часе паўстаньня пры нанясеньні простых удараў царызму, пры адпоры войску, пры нападах на бастылію праклятага ворага ўсяго рускага народу.

На пралетарыят усёй Расіі глядзіць цяпер з ліхаманкавай нецярплівасьцю пралетарыят усяго сьвету. Зьвяржэньне царызму ў Расіі, геройскі пачатае нашай рабочай клясай, будзе паваротным пунктам у гісторыі ўсіх краін, аблягчэньнем справы ўсіх рабочых усіх нацый, ва ўсіх дзяржавах, ва ўсіх канцох зямлі. І няхай кожны сацыял-дэмакрат, няхай кожны сьвядомы рабочы памятае пра тое, якія найвялікшыя задачы ўсенароднага змаганьня ляжаць цяпер на яго плячах. Няхай не забывае, што ён прадстаўляе патрэбы і інтарэсы і ўсяго сялянства, усёй масы працоўных і эксплёатаваных, усяго народу супроць агульнанароднага ворага. Ва ўсіх перад вачыма стаіць цяпер прыклад героеў-пралетараў Пецярбургу.

Няхай жыве рэвалюцыя!

Няхай жыве паўстаўшы пралетарыят!

Студзень 1905 г.

*) «Пачатак рэвалюцыі ў Расіі» — першы з цэлай сэрыі артыкулаў, напісаных Леніным аб становішчы ў Расіі непасрэдна пасьля Крывавай нядзелі 22(9) студзеня.

Артыкул друкуецца з выбраных твораў Леніна, том II, стар. 192-194.

А. ЕНУКІДЗЭ

Савецкая дзяржава 8 год бяз Леніна

Ужо 8 год прайшло з дня сьмерці Леніна. Гістарычнае значэньне Леніна настолькі вялікае, а разьвітыя ім пляны сацыялістычнай перабудовы грамадзтва настолькі грандыёзны і разам з тым канкрэтны, што чалавецтва яшчэ доўгія гады будзе кіравацца гэтымі ленінскімі ўказаньнямі таксама, як мы кіруемся імі ў сучасны момант.

Вось ужо 8 год як мы бяз Леніна. Але на аснове яго ўказаньняў мы будуем сацыялістычную дзяржаву і ўмацоўваем яе эканамічную і палітычную магутнасьць.

За гэтыя 8 год сусьветны імпэрыялізм і рэшткі капіталістычных элемэнтаў у нашай краіне прабавалі і прабуюць разбурыць дзяржаву пралетарскай дыктатуры. Для гэтага нашы ворагі зьвярачаюцца да арганізацыі інтэрвэнцыі, правакацыі вайны шляхам забойства нашых прадстаўнікоў, да простага нападу, як, напрыклад, напад на КУЧ, зьвярачаюцца да арганізацыі шкодніцтва ў нашай гаспадарцы, арганізуюць барацьбу супроць экспарту нашых тавараў, змагаюцца ўсімі сродкамі супроць далейшага разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Правыя і «левыя» апартуністычныя элемэнты ня раз прабавалі цягнуць нашу палітыку на шлях уступак буржуазіі, на шлях буржуазнага перараджэньня савецкай улады.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі з ленінскай непрымірымасьцю да эксплёататарскіх кляс і іх агентуры, усямерна ўмацоўваючы правільныя адносіны паміж рабочымі і сялянамі, савецкая дзяржава шпаркімі тэмпамі будуе сацыялістычную індустрыю і перабудоўвае на сацыялістычны лад сельскую гаспадарку. Правільна праводзячы ленінскую нацыянальную палітыку нашай партыі, мы дабіліся велізарных посьпехаў ва ўмацаваньні братняга саюзу ўсіх народаў нашай краіны, стварылі Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Праводзячы па-ленінску палітыку поўнага роўнапраўя ўсіх народаў, мы ўжо маем **7 саюзных і 15 аўтаномных рэспублік, 18 аўтаномных абласьцей, 13 нацыянальных акруг, 242 нацыянальныя раёны і 5.235 нацыянальных саветаў.**

Неаслабная ўвага і дапамога эканамічна і культурна адсталым нацыянальным стварэньням з боку Саюзу ССР забясьпечвае ліквідацыю іх адсталасьці ўжо ў бліжэйшы час. Працоўныя масы ўсіх нацыянальнасьцяй Саюзу ССР згуртаванымі радамі пад сьцягам саветаў ажыцьцяўляюць генэральную лінію партыі, што і забясьпечыла нам магчымасьць ня толькі шпарка аднавіць разбураную імпэрыялістычнай вайной і інтэрвэнцыяй нашу гаспадарку, але і з посьпехам правесьці сацыялістычную яе рэканструкцыю.

Адбіваючы атакі клясавых ворагаў на савецкую дзяржаву, дзякуючы выключна высокай палітычнай сьвядомасьці і вытворчай актыўнасьці рабочай клясы і ўсіх працоўных СССР, мы змаглі ажыцьцявіць грандыёзныя пляны гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва. Прыняты ў 1929 годзе V-м усесаюзным зьездам саветаў пяцігадовы плян народна-гаспадарчага разьвіцьця Саюзу няўхільна будзе выкананы за 4 гады, а па радзе важнейшых галін будзе перавыкананы за гэты тэрмін. Скончэньне трэцяга году пяцігодкі азначае завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Мы правялі эканамічнае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае раёнаваньне, у якім раён ператвораны у вузлавы пункт, дзе вырашаюцца ўсе асноўныя пытаньні партыйна-савецкага кааперацыйнага будаўніцтва, а таксама ўнесьлі вельмі значныя папраўкі ў арганізацыю цэнтральнага апарату, якія выявіліся, у прыватнасьці, у стварэньні новых наркаматаў шляхам вылучэньня вырасшых галін гаспадаркі з ВСНГ, НКШЗ і г. д., а таксама ў стварэньні Наркамзему Саюзу ССР, Савету Камунальнай Гаспадаркі і інш., няўхільна сьледуючы ленінскім указаньням аб барацьбе за эканамічную незалежнасьць нашай краіны ад краін капіталізму. Мы ўсе гэтыя гады асабліва вялікую ўвагу аддавалі і аддаем разьвіцьцю прамысловасьці, якая выпрацоўвае сродкі вытворчасьці, усямерна разьвівалі і разьвіваем цяжкую індустрыю. У гэтай галіне мы дасягнулі такіх посьпехаў, што ўжо VI зьезд саветаў Саюзу ССР у 1931 г. паставіў канкрэтна задачу дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя краіны капіталізму не далей, як у бліжэйшае дзесяцігодзьдзе. Ажыцьцяўленьне гэтай пастановы VI зьезду саветаў і выкананьне тым самым ленінскага лёзунгу «дагнаць і перагнаць» ідзе гіганцкімі крокамі наперад.

У той час, як Саюз ССР, дзякуючы шпаркім тэмпам разьвіцьця вытворчасьці, адчувае недахват кваліфікаванай рабочай сілы, у краінах капіталізму, дзе шматслаўная хвалёная буржуазіяй і меншавікамі «свабодная канкурэнцыя», людзі паміраюць з голаду і ня вытрымаўшы барацьбы за існаваньне, канчаюць жыцьцё самагубствам.

Беднацка-серадняцкія масы вёскі, абапіраючыся на гіганцка-ўзросшую сацыялістычную індустрыю, на цьвёрдае кіраўніцтва рабочай клясы, рашуча прыступілі да будаўніцтва калгасаў. Гэтыя масы ўсё больш пераконваюцца ў правільнасьці палітыкі, якая праводзіцца савецкай уладай, у тым, што адзіна правільным шляхам выхаду з вякавой галечы, у якой іх трымае дробная аднаасобная гаспадарка, зьяўляецца ленінскі каапэрацыйны плян.

Больш за 62 проц. беднацка-серадняцкіх гаспадарак ужо ўвайшлі ў калгасы. У асноўных збожжавых раёнах ужо завершана суцэльная калектывізацыя і на гэтай базе ў іх ліквідавана кулацтва як кляса. Калгасьнік ператвараецца ў цэнтральную фігуру зямляробства, у моцную апору савецкай улады.

Усе гэтыя посьпехі дасягнуты намі ў прамысловасьці і ў асабліва ў сельскай гаспадарцы, забясьпечваюць нам ажыцьцяўленьне шпаркімі тэмпамі культурнай рэвалюцыі і падрыхтоўку новых кадраў з ударнікаў і калгасьнікаў. Гэтыя новыя кадры, прайшоўшыя ленінскую школу, усё больш уладаючы тэхнікай вытворчасьці і ўжываючы новыя мэтады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на аснове шасьці ўмоў тав. Сталіна, — вядуць напружаную барацьбу за яшчэ больш высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва пад кіраўніцтвам саветаў.

Каб з посьпехам змагацца за новыя вышыні сацыялістычнага будаўніцтва ў сучасны момант, калі наша краіна ўступіла ў пэрыяд сацыялізму, калі клясавая барацьба ўсё больш абвастраецца, нам неабходна яшчэ больш павысіць клясавую настарожанасьць да нашых ворагаў. Гэта аднолькава адносіцца як да нашай работы ў калгасах, на прадпрыемствах, так і да работы савецкіх органаў зьнізу даверху. Гэта адносіцца да ўсіх практыкаў сацыялістычнага будаўніцтва і асабліва да нашых тэарэтычных работнікаў і навукова-дасьледчых устаноў. Наша партыя тым і моцная, што ўся яе штодзённая практычная работа па кіраўніцтве сацыялістычным будаўніцтвам заўсёды цесна ўвязана з марксыцка-ленінскай тэорыяй. І невыпадкова таму клясавыя ворагі прабуюць працягнуць антыбальшавіцкія, антыленінскія ўстаноўкі пры распрацоўцы тых ці іншых тэарэтычных палажэньняў. Уладзімер Ільліч бязьлітасна выкрываў і непрымірыма бічаваў усіх, хто прабаваў сказіць або рэвізаваць тэорыю рэвалюцыйнага марксызму і генэральную лінію партыі.

Наша партыя пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, на чале з тав. Сталіным, сьледуючы гэтаму ленінскаму прынцыпу, вядзе непрымірымую барацьбу з усякімі спробамі працягваньня антыбальшавіцкай, антымарксыцкай кантрабанды ў марксыцка-ленінскую тэорыю, адкуль-бы гэтыя спробы ні выходзілі. Відома, што гэтыя спробы сказіць марксыцка-ленінскае вучэньне аб дзяржаве пралетарскай дыктатуры, спробы кантрабанднага працягваньня антыленінскіх установак у канкрэтную работу па арганізацыі і ўмацаваньні саветаў — знайшлі сваё выяўленьне ў кулацкіх, па сутнасьці, прапанавах перадачы функцый сельсаветаў калгасам, рэвізіі лініі ў пытаньнях кіраўніцтва саветамі і паклёпу на партыю, што яна саветамі ня кіруе і інш.

Усе гэтыя вылазкі клясавых ворагаў накіраваны супроць ленінскіх установак, супроць умацаваньня саветаў, супроць умацаваньня пралетарскай дыктатуры. Гэтыя вылазкі клясавага ворага неабходна сваячасова выкрываць і рашуча з імі змагацца.

Неабходна ўсямерна ўмацоўваць саветы шляхам павышэньня тэарэтычнага ўзроўню савецкіх кадраў, шляхам высоўваньня на кіруючую работу ў саветах лепшых ударнікаў і ўдарніц, лепшых калгасьнікаў і калгасьніц.

БССР становіцца краінай суцэльнай пісьменнасьці

«Мы павінны ўзяцца за простую істотную справу мабілізацыі пісьменных і барацьбы з няпісьменнасьцю» — гаварыў Уладзімер Ільліч на зьезьдзе па па-зашкольнай асьвеце ў пачатку 1919 году.

У той час краіна знаходзілася ў агні грамадзянскай вайны, інтэрвэнцыі, голаду, разбурэньня народнай гаспадаркі. Ленін ставіў задачу барацьбы за ўзьдым асьветы шырокіх працоўных мас, задачу ліквідацыі няпісьменнасьці, бо разумеў, што без павышэньня культурнага ўзроўню народных мас нельга будзе хутка і з посьпехам будаваць сацыялістычную гаспадарку, нельга падрыхтаваць пралетарскія кадры і вырашыць гістарычныя пытаньні пралетарскай рэвалюцыі.

Пасьля таго, як СНК быў прыняты ленінскі дэкрэт і арганізавана Надзвычайная камісія па ліквідацыі няпісьменнасьці, Ленін у адным са сваіх выступленьняў заявіў:

«... мы нарабілі цудаў і ў ваеннай галіне і ў іншых. Сярод гэтых цудаў самае вялікае цуда, я думаю, было-б тое, каб ЛІКВІДАВАЦЬ ДА КАНЦА САМУЮ КАМІСІЮ ПА ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ».

За 8 год бяз Леніна сотні тысяч і мільёны працоўных ліквідавалі сваю няпісьменнасьць і малапісьменнасьць, сталі ў рады актыўных, сьвядомых змагароў за сацыялізм.

Лепшым помнікам для Уладзімера Ільліча зьяўляецца рост асьветы шырокіх працоўных мас, тое, што ў мінулым мільённыя масы няпісьменных атрымалі магчымасьць чытаць і вывучаць Леніна, па-ленінску змагацца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Беларусь у мінулым была адной з самых адсталых і няпісьменных акраін царскай імпэрыі. У 1920 г. БССР мела больш 70 проц. няпісьменнага насельніцтва. У той час яшчэ зусім нязначны процант дзяцей быў ахоплен школай.

Толькі прыход да ўлады пралетарыяту, які пад кіраўніцтвам ленінскай партыі вырашыў нацыянальнае пытаньне, забясьпечыў магчымасьць культурнага росту працоўных, будаўніцтва нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце культуры.

Наша партыя ў барацьбе за пісьменнасьць зламала супраціўленьне клясавага ворага на культурным фронце, мабілізавала самыя шырокія масы працоўных для вырашэньня задач культурнай рэвалюцыі.

БССР 8-ю гадавіну сьмерці Леніна сустракае з новымі дзесяткамі і сотнямі тысяч пісьменных. Зараз БССР знаходзіцца НАПЯРЭДАДНІ выкананьня задач, пастаўленых партыяй аб усеагульнай ліквідацыі няпісьменнасьці.

Ленінскія дні супадаюць з днямі штурму, які абвешчан па ліквідацыі няпісьменнасьці ў БССР. Ленінскія дні на месцах будуць скарыстаны для 100-проц. ахопу ўсіх няпісьменных лікпунктамі, для замацаваньня высокага наведваньня няпісьменнымі школьнай сеткі і для ўзьняцьця ўсёй школьнай работы на вышэйшую ступень.

Збылося тое цуда, аб якім гаварыў 12 год таму назад Уладзімер Ільліч. Мы зараз знаходзімся напярэдадні таго часу, калі БССР і ўвесь Савецкі Саюз стануць краінай суцэльнай пісьменнасьці, калі канчаткова будзе ліквідавана спадчына царскага ўраду.

Велізарны размах культурнай рэвалюцыі, удзел у ёй мільённых мас працоўных—бліскучы прыклад таго, як наша партыя вырашае задачы, пастаўленыя Леніным у галіне культурна-нацыянальнага будаўніцтва.

Адначасова з пасьпяховай работай па ліквідацыі няпісьменнасьці ленінская партыя ажыцьцяўляе ўказаньні Уладзімера Ільліча аб будаўніцтве палітэхнічнай школы.

БССР—рэспубліка, якая адна з першых выканала наказы правадыра рабочай клясы аб правядзеньні ўсеагульнага навучаньня.

Рост школьнай сеткі, тэхнікумаў, ВНУ, ВТНУ, навукова-дасьледчых інстытутаў, арганізацыя Акадэміі Навук, вырашэньне праблемы падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў — рэзультат ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, рэзультат барацьбы нашай партыі і пад яе кіраўніцтвам рабочай клясы за стварэньне нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце культуры.

Бар. Пятроў.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

І. Сталін

Прамова на вечары крамлёўскіх курсантаў школы УсеЦВК прысьвечаным памяці Ул. І. Леніна*)

Таварышы! Мне сказалі, што ў вас тут наладжан вечар успамінаў, а я запрошан на вечар у якасьці аднаго з дакладчыкаў. Я думаю, што няма неабходнасьці ў зьвязным дакладзе аб дзейнасьці тав. Леніна. Я думаю, што было-б лепш абмежавацца паведамленьнем раду фактаў, якія адзначаюць некаторыя асаблівасьці тав. Леніна, як чалавека і дзеяча. Паміж гэтымі фактамі, можа быць, і ня будзе ўнутранай сувязі, але гэта ня можа мець рашаючага значэньня для агульнага прадстаўленьня аб тав. Леніне. Ва ўсякім выпадку, я ня маю магчымасьці ў дадзеным выпадку даць вам больш таго, што абяцаў вышэй.

Упяршыню я пазнаёміўся з тав. Леніным у 1903 г. Праўда, гэта знаёмства было не асабістае, а завочнае, у парадку перапіскі. Але яно пакінула ў мяне незабыўнае ўражаньне, якое не пакідала мяне за ўвесь час маёй работы ў партыі. Я знаходзіўся тады ў Сібіры, у ссылцы. Знаёмства з рэвалюцыйнай дзейнасьцю тав. Леніна з канца 90-х гадоў і асабліва пасьля 1901 году, пасьля выданьня «Іскры», пераканала мяне, што мы маем ў асобе тав. Леніна чалавека незвычайнага. Ён ня быў тады ў маіх вачох простым кіраўніком партыі, ён быў яе фактычным творцам, бо ён адзін разумеў яе ўнутраную сутнасьць і неадкладныя патрэбы. Калі я параўноўваў яго з іншымі кіраўнікамі нашай партыі, мне ўвесь час здавалася, што паплечнікі тав. Леніна—Плеханаў, Мартаў, Аксэльрод і інш.—стаяць ніжэй тав. Леніна цэлай галавой, што Ленін параўнальна з імі не проста адзін з кіраўнікоў, а кіраўнік вышэйшага тыпу, горны арол, які ня ведае страху ў змаганьні і які адважна вядзе наперад партыю па нявыведаных шляхох расійскага рэвалюцыйнага руху. Гэта ўражаньне так глыбока запала мне ў душу, што я адчуў неабходнасьць напісаць аб ім аднаму свайму блізкаму сябру, які знаходзіўся ў той час у эміграцыі, патрабуючы ад яго водгуку. Праз некаторы час, будучы ўжо ў ссылцы ў Сібіры, —гэта было ў канцы 1903 году,—я атрымаў захапляючы адказ ад свайго сябра і просты, але глыбока зьместоўны ліст тав. Леніна, якога, як аказалася, пазнаёміў мой прыяцель з маім лістом. Ліст тав. Леніна быў параўнальна невялікі, але ён даваў смелую, бясстрашную крытыку практыкі нашай партыі і надзвычай яснае і сьціслае выкладаньне ўсяго плану работы партыі на бліжэйшы пэрыяд. Толькі Ленін умеў пісаць аб самых заблытаных рэчах так проста і ясна, сьціслa і сьмела, калі кожная фраза не гаворыць, а страляе. Гэты просты і сьмелы ліст яшчэ больш пераканаў мяне ў тым, што мы маем у асобе Леніна горнага арла нашай партыі. Не магу сабе дараваць, што гэты ліст тав. Леніна, як і многія другія лісты, па прывычцы старога падпольшчыка, я спаліў. З гэтага часу пачалося маё знаёмства з тав. Леніным.

Упяршыню я сустрэўся з тав. Леніным у сьнежні 1905 г. на канфэрэнцыі бальшавікоў у Таммэрфорсе (у Фінляндыі). Я спадзяваўся ўбачыць горнага арла нашай партыі, вялікага чалавека, вялікага ня толькі палітычна, але, калі хочаце, і фізычна, бо тав. Ленін рысаваўся ў маім уяўленьні ў выглядзе волата, статнага і прадстаўнічага. Якое-ж было маё расчараваньне, калі я ўбачыў самага звычайнага чалавека, ніжэй сярэдняга росту, які нічым, літаральна нічым не адрозьніваўся ад звычайных сьмяротных. Прынята, што «вялікі чалавек» звычайна павінен спазьняцца на сходы з тым, каб члены сходу з заміраньнем сэрца чакалі яго зьяўленьня, прычым перад зьяўленьнем вялікага чалавека члены сходу папярэджваюць: «Тсс... цішэй... ён ідзе». Гэта абраднасьць здавалася мне не лішняй, бо яна імпануе, выклікае павагу. Якім-ж было маё расчараваньне, калі я даведаўся, што Ленін зьявіўся на сход раней дэлегатаў і, забіўшыся недзе ў кут, па-прасьцецку вядзе гутарку, самую звычайную гутарку з самымі звычайнымі дэлегатамі канфэрэнцыі. Не ўтаю, што гэта здалося мне тады некаторым парушэньнем некаторых неабходных правіл. Толькі потым я зразумеў, што гэта прастата і сьціпласьць тав. Леніна, гэта імкненьне застацца непрыкметным, ці ва ўсякім выпадку, ня кідацца ў вочы і не падкрэсьліваць свайго высокага становішча,—гэта рыса зьяўляецца адной з найбольш моцных тав. Леніна, як новага правадыра новых мас, простых і звычайных мас найглыбейшых «нізоў» чалавецтва.

Выдатнымі былі дзьве прамовы тав. Леніна, сказаныя на гэтай канфэрэнцыі: аб бягучым момэнце, і аб аграрным пытаньні. Яны, на жаль, не захаваліся. Гэта былі натхнёныя прамовы, якія выклікалі бурнае захапленьне ўсёй канфэрэнцыі. Нязвычайная сіла пераканаўчасьці, прастата і яснасьць аргумэнтацыі, кароткія і ўсім зразумелыя фразы, адсутнасьць рысоўкі, адсутнасьць галавакружлівых гестаў і гучных фраз, якія б'юць на эфэкт, — усё гэта выгадна адрозьнівала рэчы т. Леніна ад прамоў звычайных «парляманцкіх прамоўцаў». Але мяне палаліў тады ня гэты бок прамоў т. Леніна. Мяне палаліла тая непераможная сіла лёгікі, якая некалькі суха, але затое грунтоўна аўладае аўдыторыяй, паступова электрызуе яе і потым бярэ яе ў палон, як гавораць, без астачы. Я памятаю, як гаварылі тады многія з дэлегатаў: «Лёгіка ў прамовах т. Леніна, — гэта нейкія ўсясільныя шчупальцы, якія ахапляюць цябе з усіх бакоў клешчамі і з абдымак якіх няма магчымасьці вырвацца: або здавайся, або адважвайся на поўны правал».

Я думаю, што гэта асаблівасьць у прамовах т. Леніна зьяўляецца самым моцным бокам яго аратарскага майстэрства.

Другі раз сустрэў я тав. Леніна ў 1906 годзе на Стакгольмскім зьезьдзе нашай партыі. Вядома, што на гэтым зьезьдзе бальшавікі засталіся ў меншасьці — пацярпелі паражэньне. Я ўпяршыню бачыў тады т. Леніна ў ролі пераможанага. Ён ні на ёту не нагадваў тых правадыроў, якія хныкаюць і ўпываюць пасьля паражэньня. Наадварот, паражэньне ператварыла т. Леніна ў згустак энэргіі, які натхняў сваіх прыхільнікаў да новых баёў, да будучай перамогі. Я гавару аб паражэньні т. Леніна. Але якое гэта было паражэньне? Трэба было паглядзець на працаўнікаў тав. Леніна, пераможцаў на Стакгольмскім зьезьдзе — Плеханава, Аксэльрода, Мартава і інш.: яны вельмі мала нагадвалі сапраўдных пераможцаў, бо т. Ленін у сваёй бязьлітаснай крытыцы меншавізму не пакінуў на іх, як гаворыцца, жывога месца. Я памятаю, як мы, дэлегаты-бальшавікі, зьбіўшыся ў кучу, глядзелі на тав. Леніна, пытаючы ў яго парады. У прамовах некаторых дэлегатаў прагладалі стомленасьць, журба. Помніцца, як т. Ленін у адказ на такія прамовы едка працадзіў скрозь зубы: «Ня хныкайце, таварышы, мы напэўна пераможам, бо мы маем рацыю». Нянавісьць да хныкаючых інтэлігентаў, вера ў свае сілы, вера ў перамогу, — вось аб чым гаварыў тады з намі т. Ленін. Адчувалася, што паражэньне бальшавікоў зьяўляецца часовым, што бальшавікі павінны перамагчы ў бліжэйшым будучым.

«Ня хныкаць з прычыны паражэньня», — гэта тая самая асаблівасьць у дзейнасьці т. Леніна, якая дапамагла яму згуртаваць вакол сябе адданую да канца і веруючую ў свае сілы армію.

На наступным зьезьдзе ў 1907 годзе ў Лёндане бальшавікі аказаліся пераможцамі. Я ўпяршыню бачыў тады т. Леніна ў ролі пераможцы. Звычайна перамога кружыць галовы іншым правадыром, робіць іх ганарыстымі. Часьцей за ўсё, у такіх выпадках пачынаюць сьвяткаваць перамогу, пачываць на лаўрах. Але Ленін ані ня быў падобны да такіх правадыроў. Наадварот, іменна пасьля перамогі ён станавіўся асабліва пільным і чулым. Помніцца, як т. Ленін настойліва гаварыў тады дэлегатам: «Першая справа — не захапляцца перамогай і не ганарыцца; другая справа — замацаваць за сабой перамогу; трэцяя — дабіць працаўніка, бо ён толькі пабіт, але далёка яшчэ не дабіт». Ён едка высьмейваў тых дэлегатаў, якія лёгкадумна запэўнялі, што «з гэтага часу з меншавікамі пакончана». Яму ня цяжка было даказаць, што меншавікі ўсё яшчэ маюць карэньні ў рабочым руху, што з імі трэба змагацца ўмеючы, усяляк ухіляючыся пераацэнкі сваіх сіл і, асабліва, недаацэнкі сіл працаўніка.

«Не ганарыцца перамогай», — гэта тая самая асаблівасьць у характары т. Леніна, якая дапамагала яму цьвяроза ўзважваць сілы працаўніка і застрахоўваць партыю ад магчымых нечаканасьцяй.

Правадыры партыі ня могуць не даражыць думкай большасьці сваёй партыі. Большасьць — гэта сіла, з якой ня можа ня лічыцца правадыр. Ленін гэта разумеў ня горш, чым усякі іншы кіраўнік партыі. Але Ленін ніколі не станавіўся палоньнікам большасьці, асабліва, калі гэта большасьць ня мела пад сабой прынцыповай падставы. Бывалі моманты ў гісторыі нашай партыі, калі думка большасьці або мінутныя інтарэсы партыі прыходзілі ў канфлікт з карэннымі інтарэсамі пралетарыяту. У такіх выпадках Ленін, не задумваючыся, рашуча станавіўся на бок прынцыповасьці супроць большасьці партыі. Больш таго, — ён не баяўся выступаць у такіх выпадках літаральна адзін супроць усіх, разьлічваючы на тое, — як ён часта гаварыў, — што: «Прынцыповая палітыка ёсьць самая верная палітыка».

Асабліва характэрны у гэтых адносінах два наступных факты з жыцьця і дзейнасьці т. Леніна.

Першы факт. Пэрыяд 1909-1911 г., калі партыя, разьбітая контр-рэвалюцыяй, перажывала поўнае разлажэньне. Гэта быў пэрыяд страты веры ў партыю, пэрыяд павальнага ўцяканьня з партыі ня толькі інтэлігентаў, але часткова і рабочых, пэрыяд адмаўленьня падпольля, пэрыяд ліквідатарства і развалу. Ня толькі меншавікі, але і бальшавікі прадстаўлялі тады цэлы рад фракцый і плыняй, большай часткай адарваных ад рабочага руху. Вядома, што ў гэты іменна пэрыяд узьнікла ідэя поўнай ліквідацыі падпольля і арганізацыі рабочых у легальную лібэральную сталыпінскую партыю. Ленін тады быў адзіным, які не падпаў пад агульнае паветрые і высока трымаў сьцяг партыйнасьці, зьбіраючы разрозьненыя і разьбітыя сілы партыі з дзіўным цярпеньнем і з нябывалай упартасьцю, змагаючыся супроць усіх і ўсякіх антыпартыйных плыняй унутры рабочага руху, адстойваючы партыйнасьць з нябывалай мужнасьцю і з нябачанай настойлівасьцю. Вядома, што ў гэтых спрэчках за партыйнасьць Ленін аказаўся потым пераможцай.

Рост валавой прадукцыі рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці ВСНГ БССР.

Другі факт. Пэрыяд 1914-1917 г. г., пэрыяд разгару імпэрыялістычнай вайны, калі ўсе або амаль усе сацыял-дэмакратычныя і сацыялістычныя партыі, падпаўшы пад агульны патрыятычны ўгар, сталі сабе на службу бацькаўскаму імпэрыялізму. Гэта быў пэрыяд, калі II Інтэрнацыянал схіліў свае сьцягі перад капіталам, калі перад шавіністычнай хваляй не ўстаялі нават такія людзі, як Плеханаў, Каўцкі, Гед і іншыя. Ленін быў тады адзіным, або амаль адзіным, які ўзьняў рашучую барацьбу супроць сацыял-шавінізму, выкрываў здраду Гедаў і Каўцкіх і кляйміў палавіннасьць межаумачных «рэвалюцыянэраў». Ленін разумеў, што ён мае за сабой нязначную меншасьць, але гэта ня мела для яго рашаючага значэньня, бо ён ведаў, што адзіна правільнай палітыкай, якая мае за сабой будучыню, зьяўляецца палітыка пасьлядоўнага інтэрнацыяналізму, бо ён ведаў, што прынцыповая палітыка ёсьць самая правільная палітыка. Вядома, што і ў гэтых спрэчках за новы Інтэрнацыянал Ленін таксама аказаўся пераможцай.

«Прынцыповая палітыка ёсьць самая правільная палітыка» — гэта тая самая формула, пры дапамозе якой Ленін браў прыступам новыя «няпрыступныя» пазыцыі, завабоўваючы на бок рэвалюцыйнага марксызму лепшыя элемэнты пралетарыяту.

Тэарэтыкі і правадыры партыі, якія ведаюць гісторыю народаў, і праштудыравалі гісторыю рэвалюцый ад пачатку да канца, хвароюць часам на адну няпрыстойную хваробу. Хвароба гэта завецца боязьню мас, пявер'ем у творчыя здольнасьці мас. На гэтай глебе ўзьнікае часам нейкі арыстакратызм правадыроў у адносінах да мас, невыпрабаваных у гісторыі рэвалюцый, але заклікаемых ламаць старое і будаваць новае. Боязьнь, што стыхія можа разбушавацца, што масы могуць «паламаць шмат лішняга», жаданьне разыграць ролю мамкі, якая стараецца вучыць масы па кніжках, але не жадае вучыцца ў мас, — такава аснова гэтага роду арыстакратызму. Тав. Ленін прадстаўляў поўную процілегласьць такім правадыром. Я ня ведаю іншага рэвалюцыянэра, які так глыбока верыў-бы ў творчыя сілы пралетарыяту і ў рэвалюцыйную мэтазгоднасьць яго клясавага інстынкту, як тав. Ленін. Я ня ведаю іншага рэвалюцыянэра, які ўмеў-бы так бязьлітасна бічаваць самазадаволеных крытыкаў «хаоса рэвалюцыі» і «вакханаліі самачынных дзеяньняў мас», як т. Ленін. Помніцца, як у часе аднэй гутаркі ў адказ на заўвагу аднаго з таварышоў, што «пасьля рэвалюцыі павінен ўстанавіцца нармальны парадак» т. Ленін саркастычна заўважыў: «Бяда, калі людзі, якія жадаюць быць рэвалюцыянэрамі, забываюць, што найбольш нармальным парадкам у гісторыі зьяўляецца парадак рэвалюцыі». Адсюль пагардлівыя адносіны тав. Леніна да ўсіх тых, якія імкнуліся звысока глядзець на масы і вучыць іх па кніжках. Адсюль нястомная прапаведзь т. Леніна: вучыцца ў мас, асмысьліваць іх дзеяньні, дакладна вывучаць практычны вопыт барацьбы мас.

Вера ў творчыя сілы мас — гэта тая самая асаблівасьць у дзейнасьці т. Леніна, якая давала яму магчымасьць асмысьліць стыхію і накіраваць яе рух у рэчышча пралетарскай рэвалюцыі.

Ленін быў народжаны для рэвалюцыі. Ён быў сапраўды геніем рэвалюцыйных выбухаў і вялізарнейшым майстрам рэвалюцыйнага кіраўніцтва. Ніколі ён не адчуваў сябе так вольна і радасна, як у эпоху рэвалюцыйных патрасеньняў. Гэтым я зусім не хачу сказаць, што т. Ленін аднолькава ўхваляў усякае рэвалюцыйнае патрасеньне і што ён заўсёды і пры ўсякіх умовах стаяў за рэвалюцыйныя выбухі. Ніколі. Гэтым я хачу толькі сказаць, што ніколі геніяльная празорлівасьць т. Леніна не праяўлялася так поўна і выразна, як у часе рэвалюцыйных выбухаў. У дні рэвалюцыйных паваротаў ён літаральна расьцьвітаў, рабіўся яснавідцам, прадугледжваў рух клясаў і магчымыя зігзагі рэвалюцыі, бачучы іх як на далоні. Недарма гаварылася ў нашых партыйных колах, што «Ільліч умее плаваць у хвалях рэвалюцыі, як рыба ў вадзе». Адсюль «зьдзіўляючая» яснасьць тактычных лёзунгаў і галавакружэльная сьмеласьць рэвалюцыйных замыслаў т. Леніна.

Успамінаюцца два асабліва характэрных факты, якія адзначаюць гэту асаблівасьць у рэвалюцыйнай рабоце т. Леніна.

Першы факт. Пэрыяд перад кастрычніцкім пераваротам, калі мільёны рабочых, сялян і салдатаў, якія падганяліся крызісам у тыле і на фронце, і патрабавалі міру і волі; калі генэралітэт і буржуазія падрыхтоўвалі ваенную дыктатуру ў інтарэсах «вайны да канца»; калі ўся так званая грамадзкая думка, усе так званыя сацыялістычныя партыі сталі супроць бальшавікоў, трэтуючы іх нямецкімі шпіёнамі; калі Керанскі прабаваў загнаць у падпольле — і часткова ўжо насьпеў загнаць—партыю бальшавікоў, калі ўсё яшчэ магутныя дысцыплінаваныя арміі аўстра-германскай кааліцыі стаялі супроць нашых стомленых і разложаных армій, а заходня-эўрапэйскія «сацыялісты» заставаліся ў блёку са сваімі ўрадамі ў інтарэсах «вайны да поўнай перамогі»... Што значыла ўзьняць паўстаньне ў такі момант? Падняць паўстаньне ў такой абстаноўцы — гэта значыцца паставіць усё на карту. Але тав. Ленін не баяўся рызыкнуць, бо ён ведаў, бачыў сваім яснавідзячым зрокам, што паўстаньне немінуча, што паўстаньне пераможа, што паўстаньне ў Расіі падрыхтуе канец імпэрыялістычнай вайны, што паўстаньне ў Расіі ўскалыхне змучаныя масы Захаду, што паўстаньне ў Расіі ператворыць вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую, што паўстаньне дасьць рэспубліку саветаў, што рэспубліка саветаў паслужыць аплотам рэвалюцыйнага руху ва ўсім сьвеце.

Вядома, што гэта рэвалюцыйнае прадбачаньне т. Леніна зьбылося потым з небачанай дакладнасьцю.

Другі факт. Першыя дні пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі Савет Народных Камісараў прабаваў прымусіць «мяцежнага» генэрала, галоўнакамандуючага Духоніна, спыніць ваенныя дзеяньні і адкрыць перагаворы з немцамі аб перамір'і. Помніцца, як т. Ленін, Крыленка (будучы галоўнакамандуючы) і я адправіліся ў Галоўны Штаб у Піцеры да провада для перагавораў з Духоніным. Мінута была жудасная. Духонін і стаўка катэгарычна адмаўляліся выканаць загад Саўнаркому. Камандны склад арміі цалкам знаходзіўся ў руках стаўкі. Што датычыць салдатаў, дык было невядома, што скажа 12-ці млн. армія, падпарадкаваная так званым армейскім арганізацыям настроеным супроць Савецкай улады. У самым Піцеры, як вядома, насьпявала тады паўстаньне юнкераў. Апрача таго, Керанскі ішоў на Піцер вайной. Помніцца, як, пасьля некаторай паўзы каля провада, твар т. Леніна асьвятліўся нейкім незвычайным сьвятлом. Відаць было, што ён ужо прыняў рашэньне. «Пойдзем на радыё-станцыю, — сказаў т. Ленін, — яна нам саслужыць карысьць: мы зьмясьцім у спэцыяльным загадзе генэрала Духоніна, прызначым на яго месца галоўнакамандуючым т. Крыленка і зьвернемся да салдатаў праз галаву каманднага складу з заклікам—акружыць генэралаў, спыніць ваенныя дзеяньні, зьвязацца з аўстра-германскімі салдатамі і ўзяць справу міра ў свае ўласныя рукі». «Гэта быў скачок у невядомасьць». Але т. Ленін не баяўся гэтага «скачка», наадварот ён шоў яму насустрач, бо ён ведаў, што армія хоча міра і яна заваюе мір, зьмятаючы на шляху да міра ўсё і ўсякія перашкоды, бо ён ведаў, што такі спосаб замацаваньня міра ня пройдзе дарма для аўстра-германскіх салдатаў, што ён разьвяжа цягу да міру на ўсіх без выключэньня франтах.

Вядома, што гэта рэвалюцыйнае прадбачэньне т. Леніна таксама збылося потым з усёй дакладнасьцю.

Гэтым, я канчаю, таварышы, сваю прамову. Няма чаго і гаварыць, што я ня вычарпаў і дзесятай долі тых успамінаў, аб якіх трэба было-б вам расказаць. Але абмяжуемся пакуль сказаным, адклаўшы астатнія да наступнага разу.

«Праўда», № 34,
12 лютага, 1924 г.

*) Данная прамова тав. Сталіна была зьмешчана ў «Праўдзе» № 34, ад 12 лютага 1924 году.



Рост сельгасмашынабудаўніцтва ў СССР.

Р. Шаранговіч

НАПЯРЭДАДНІ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б*)

**

КП(б)Б дабілася значных посьпехаў у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. З часу XIII зьезду мы ў гэтай галіне атрымалі рашаючыя посьпехі, галоўныя з якіх выяўляюцца ў наступным.

Процант ахопу з 11,3 да XIII зьезду КП(б)Б узьняўся да 50,3, да XIV зьезду (на 20 сьнежня 1931 году). На кожны калгасны двор прыпадае ў два разы больш засеву, чым на аднаасобны. У веснавую пасяўную кампанію ў 1931 годзе калгасы засеялі 47,3 проц. яравога клину. Лён, засеяны калгасьнікамі, заняў 51,3 проц., гародніна — 64,1 проц. і карэньплоды — 66 проц.

За апошнія два гады колькасьць сеялкаў павялічылася амаль на 50 проц., а адносная вага іх плошчы павялічылася ў тры разы. Укладаньні ў сельскую гаспадарку БССР у 1931 годзе выраслі на 59,3 проц.

Дасягнуты вялікія посьпехі ў галіне спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі ў напрамку разьвіцьця жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Плошча засеву пад ільном узрасла ў параўнаньні з 1930 годам на 55,3 проц. і пад каноплямі — на 52 проц. Агульны прырост пасеўнай плошчы за 1931 год склаў 5,5 проц.

Пашырылася машынізацыя. За 1931 год арганізавана 27 новых МТС у той час, як у 1930 годзе іх было 6. Трактарны парк зараз налічвае 1911 трактараў супроць 723 трактараў у 1930 годзе. За 1931 год завезена с.-г. машын на суму каля 13 мільёнаў рублёў.

Гэтыя посьпехі дасягнуты ў рашучай барацьбе як з права-апартуністычным сабатажам і скажэньнямі лініі партыі ў калгасным руху, так і з «лявацкімі» перагібамі, практыка якіх мела значнае распаўсюджаньне ў радзе раёнаў (Лельчыцы, Койданава, Капыль і інш.). ЦК КП(б)Б ня раз прыходзілася рашуча выпраўляць памылкі ў калгасным руху, якія мелі месца ў радзе раёнаў і прымаць жорсткія меры да вінаватых у скажэньнях лініі партыі.

Было-б няправільна замазваць дасягнутыя посьпехі ў справе калектывізацыі, таксама, як і ідэалізаваць калгасы, забываючы, што ў іх захоўваюцца элемэнты клясавай барацьбы, што кулацтва зараз бярэ стаўку на разбурэньне калгасаў з сярэдзіны і аказвае шалёнае супраціўленьне выкананьню цэнтральнай задачы ў калгасным будаўніцтве — арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў. Было-б няправільна і недаацэньваць усёй складанасьці задач, якія перад намі стаяць на гэтым вучастку работы.

Наяўнасьць кулацка-спэкулянцкіх і рвацкіх тэндэнцый і настрояў у радзе калгасаў, што асабліва выявілася пры правядзеньні сялгатовак (дутыя абсяжкі, фуражныя балянсы, разьмеркаваньне ўраджаю паводле прынцыпу «спачатку сабе, а потым дзяржаве»), — усё гэта настойліва высоўвае задачу сацыялістычнага выхаваньня калгасьніка і робіць яе (задачу) асабліва актуальнай, як і задачу ачысткі калгасаў ад кулацка-варожых элемэнтаў.

Рад калгасаў засьмечан кулацка-варожымі элемэнтамі.

Наяўнасьць усіх гэтых фактаў яшчэ больш выразна падкрэсьлівае важнасьць мабілізацыі ўсёй КП(б)Б на вырашэньне задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Гэта задача зьяўляецца цэнтральнай у калгасным руху і толькі праз яе ажыцьцяўленьне мы зможам завяршыць у асноўным суцэльную калектывізацыю БССР у 1932-33 гадох.

Ці ўсе зьвеньні партыйнай арганізацыі і калгаснай сыстэмы шчыльна падыйшлі да ўмацаваньня калгасаў. На гэта пытаньне прыходзіцца даць адмоўны адказ. Пры наяўнасьці бясспрэчнага павароту ўсёй КП(б)Б да гэтай справы, мы яшчэ ня маем выстарчальнага павароту ўсіх зьвеньняў партыйных і калгасных арганізацый да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. У радзе раёнаў мае месца і да гэтага часу пагоня за дутымі процантамі калектывізацыі, існуе ігнараваньне неабходнасьці сканцэнтраваць галоўную ўвагу на арганізацыйна-гаспадарчым ўмацаваньні калгасаў.

У пытаньнях калектывізацыі былі дапушчаны памылкі з боку ЦК КП(б)Б рашуча выпраўленыя на лістападаўскім пленуме ЦК і ЦКК КП(б)Б. На лютаўскім пленуме ЦК была прынята пастанова аб тым, каб дабіцца да вясны 1932 году 75 проц. калектывізацыі, г. зн. завяршыць у асноўным суцэльную калектывізацыю БССР. Бязумоўна, такая пастанова ня спрыяла таму, каб канцэнтраваць галоўную ўвагу на ўмацаваньні калгасаў і давала раёнам повад гнацца за дутымі процантамі калектывізацыі.

Гэта першая памылка была паглыблена верасьнёўскай пастановай ЦК, якая была прынята пасьля вядомай пастановы ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня 1931 г. ЦК КП(б)Б у верасьнёўскай пастанове не падкрэсьліў задачу ўмацаваньня калгасаў, як цэнтральнай для ўсіх без выключэньня раёнаў. Было дапушчана разьмеркаваньне раёнаў на раёны, якія дасягнулі большы процант калектывізацыі і меншы, што фактычна не арыентавала раёны з меншым процантам калектывізацыі на ўмацаваньне калгасаў і таксама спрыяла пагоне за дутымі процантамі калектывізацыі. Пасьля зусім правільнай крытыкі і палітычнай кваліфікацыі гэтых пастаноў з боку «Праўды», ЦК прыняў устаноўку аб скончэньні ў асноўным суцэльнай калектывізацыі ў 1932-33 г. г.

Памылкі былі рашуча выпраўлены. ЦК мабілізаваў увагу ўсёй КП(б)Б на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, патрабуючы ад кожнай партыйнай арганізацыі яе канкрэтнага ажыцьцяўленьня.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў перш за ўсё упіраецца ў пытаньні арганізацыі калгаснай працы. Правільна арганізаваць працу ў калгасах, узьняць прадукцыйнасьць яе, ліквідаваць ураўнілаўку і абязьлічку можна толькі на аснове выкананьня 6 умоў тав. Сталіна ва ўмовах сельскай гаспадаркі. Іх рэалізацыя і ажыцьцяўленьне тэхнікай у сельска-гаспадарчай вытворчасьці зьяўляецца цэнтральнай задачай. У гэтым галоўнае і асноўнае.

4-ты год пяцігодкі высоўвае з асаблівай сілай праблему якасьці ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі і задачу павышэньня яе таварнасьці. Пытаньні павышэньня ўраджайнасьці на аснове сапраўды навуковых мэтадаў вядзеньня гаспадаркі, змаганьня за высокаякаснае і таварнае жывёлагадоўчае стада, бярэжлівай і эканомнай эксплёатацыі машыннага парку ў калгасах, МТС і саўгасах — робяцца вузлавымі.

Трэба дабіцца паляпшэньня якасьці работы саўгасаў і МТС, каб саўгасы і МТС яшчэ больш адыгрывалі сапраўды кіруючую ролю ва ўсёй рабоце па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Зараз асаблівай увагай трэба ўзяцца за вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы. «Праблема разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, асабліва сьвінагадоўлі, зьяўляецца актуальнай для БССР, як аднаго з важнейшых раёнаў Савецкага Саюзу» (лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б). Адсюль больш увагі камплектаваньню стада, павышэньню прадукцыйнасьці, поўнаму захаваньню маладняка і барацьбе з кулацкай агітацыяй за зьнішчэньне маладняка, больш увагі вырашэньню кармавай праблемы.

З важнейшых задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі неабходна падкрэсьліць задачу барацьбы з [illegible] коньскай цягавай сілы, задачу разьвіцьця ільну і асабліва задачу павышэньня якасных паказальнікаў у разьвіцьці тэхнічных культур.

Ужо зараз трэба разгарнуць самую шырокую масавую падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі, якая мае вялізарнейшае гаспадарча-палітычнае значэньне ў вырашэньні вызначаных задач і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у выкананьні праграмы чацьвёртага, заключнага, году пяцігодкі. Канкрэтнай баявой праграмай для падрыхтоўчай работы і правядзеньня веснавой сяўбы зьяўляецца пастанова ЦК і СНК БССР. Трэба шырока папулярызаваць гэту пастанову сярод мас, мабілізаваўшы іх на яе ажыцьцяўленьне.

Трэба па-бальшавіцку ўскрываць усякія скажэньні лініі партыі ў калгасным будаўніцтве, у палітковай [illegible], павесьці барацьбу з [illegible] у праяўленьні гаспадарча-палітычных кампаній, змагацца з існуючай і пашыранай недаацэнкай масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас. Зрабіць масавую работу асноўным рычагом ва ўсіх мерапрыемствах партыі, якія праводзяцца ў вёсцы.

Трэба поўнасьцю выканаць планы загатовак (лён, хлеб, мяса і інш.), ліквідаваўшы адставаньне БССР на гэтым вучастку.

**

Мы павінны ў далейшай рабоце зьвярачаць асаблівую ўвагу на паляпшэньне рабочага забесьпячэньня. Ці дабіліся мы ў гэтых адносінах зруху? Бязумоўна, так. 1931 год быў годам далейшага рашучага ўздыму матар'яльнага ўзроўню пралетарыяту і працоўных мас. Рэзкі ўздым жыцьцёвага ўзроўню пралетарыяту СССР асабліва вызначаецца на фоне ўзрастаючай галечы і голаду працоўных пластоў насельніцтва ў краінах капіталу.

Аднак, наяўнасьць у кааперацыйным апараце і гандлёвых арганізацыях нэпманскага духу і невыстарчальная яшчэ ўвага з іх боку да патрэбнасьцяй рабочага забесьпячэньня сьведчыць аб тым, што на гэтым вучастку работы патрабуецца яшчэ надзвычайна многа партыйнай увагі. Мы маем вялікія магчымасьці і рэсурсы, каб яшчэ больш палепшыць рабочае забесьпячэньне і задачы заключаюцца ў тым, каб гэтыя наяўныя рэсурсы поўнасьцю і лепш выкарыстаць.

Ключом да далейшага паляпшэньня забесьпячэньня працоўных, да далейшага хуткага ўздыму матар'яльнага ўзроўню пралетарыяту зьяўляецца разгортваньне савецкага гандлю на аснове савецкай палітыкі цэн. Партыя высунула праблему разгортваньня савецкага гандлю, як адну з важнейшых праблем сацыялістычнага будаўніцтва і дала рашучы адпор, як права-апартуністычным тэндэнцыям у дзяржаўных і кааперацыйна-гандлёвых апаратах, так і «лева»-апартуністычным пераскокваньням праз этап савецкага гандлю да простага прадукта-абмену і разьмеркаваньня.

Неабходна ўпарта і надалей змагацца за паляпшэньне рабочага забесьпячэньня і грамадзкага харчаваньня, зрабіць гэта справай усіх арганізацый, поўнасьцю скарыстаць усе наяўныя рэсурсы. Рашуча перабудоўваць работу кааперацыі і гандлёвых арганізацый, павысіўшы ўвагу да нізавога зьвяна — сельпо, сталоўкі, ЗРК, ЗВК і інш. Патрэбна рашуча зьнішчыць скажэньні савецкай палітыкі цэн.

Трэба рашуча ўзяцца за рэканструкцыю камунальнай гаспадаркі, ліквідаваўшы яе адставаньне ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, у прыватнасьці ўзяцца за выкананьне пастановы ЦК і СНК па Менску. Трэба памятаць, што «сёньняшні рабочы, наш савецкі рабочы, хоча жыць з задавальненьнем усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэб і ў сэнсе харчовага спабжэньня, і ў сэнсе жыльля, і ў сэнсе забесьпячэньня культурных і ўсякіх іншых патрэбнасьцяй. Ён мае на гэта права і мы абавязаны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы» (Сталін).

У сувязі з усім гэтым паўстае сур'ёзнае пытаньне аб паляпшэньні работы Белкаапсаюзу, [illegible], Наркамгандлю і іх мясцовых органаў.

**

КП(б)Б да XIV зьезду надыходзіць з вялізарнымі посьпехамі і ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Посьпехі па разгортваньні прамысловасьці, па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, дасягнутыя пры брацкай дапамозе пралетарыяту СССР, зьяўляюцца посьпехамі і ў ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі партыі.

Мы маем вялізарны размах у вырашэньні задач культурнай рэвалюцыі і посьпехі на ліквідацыі няпісьменнасьці. БССР першая з саюзных рэспублік, якая ўвяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне. Значна ўзрасла вышэйшая і сярэдняя асьвета. Павялічылася пралетарская праслойка ў навучальных установах. Пашырылася выдавецкая дзейнасьць. Дасягнуты посьпехі ў мастацкай справе. Такім чынам, за адрэзак часу ад XIII зьезду КП(б)Б мы маем значныя посьпехі ў ліквідацыі не толькі эканамічнай, але і культурнай адсталасьці БССР.

Вось некаторыя даныя. У 1931 годзе лік ВТНУ і ВПУ даведзен да 26. Ва ўсіх вышэйшых навучальных установах навучаюцца 10,5 тыс. чалавек. Лік тэхнікумаў павялічыўся да 88. Тыраж газет узрос на 34,5 проц. Галавы тыраж раённых газэт павялічыўся за 1931 год больш, як у тры разы.

1931 год зьявіўся пераломным годам у разгортваньні навукова-дасьледчай работы і падрыхтоўцы навуковых кадраў. Рэарганізавана і значна пашырана БАН, пры якой створан рад інстытутаў, с.-г. акадэмія, БДУ і інш. Дасягнуты значныя посьпехі ў галіне беларусізацыі. Разгорнута работа сярод працоўных мас нацменшасьцяй.

Дасягненьні ў нацыянальна-культурным будаўніцтве БССР зьявіліся вынікам рашучага змаганьня КП(б)Б за правільнае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі. У выніку рашучай барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, нацыянал-апартуністамі, [illegible] разьбіты і скампрамэтаваны ў вачах шырокіх мас. Аднак, гэта не выключае яго актывізацыі і праяўленьняў у далейшым з прычыны [illegible] сацыялістычнага наступленьня за[illegible] жываючых рэштак эксплёататарскіх клясаў беларускай нацыі. Актывізацыя нацыянал-шавінізму будзе праяўляцца ў далейшым не толькі ў старых, але магчыма і ў новых больш скрытых і замаскаваных формах. Барацьба з ім павінна праводзіцца з няўхільнай пасьлядоўнасьцю і ў далейшым, і патрабуе бязьлітаснага зрываньня масак з яго найбольш скрытых форм.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі магчыма толькі пры ўмове рашучай барацьбы з ухіламі ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца і застаецца галоўнай небясьпекай, не аслабляючы барацьбы з праяўленьнямі ўхілу да мясцовага шавінізму: беларускага, яўрэйскага, польскага і інш.

Аднак, за апошні час, як гэта адзначана ў сьнежаньскай пастанове ЦК і ЦКК КП(б)Б, у асобных зьвеньнях партыйнай арганізацыі ёсьць яўнае аслабленьне барацьбы з ухіламі ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму. Рад выпадкаў не атрымаў своечасовага рашучага адпору з боку мясцовых парт. арганізацый. Не разгорнута яшчэ сыстэматычнае выкрываньне праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму, якое за апошні час мае ўсе адзнакі актывізацыі.

Даволі паказальна на выступленьне Вальфсона і Выдры, якія крытыкавалі беларускі нацыянал-дэмакратызм не з партыйных пазыцый па нацыянальным пытаньні, а з пазыцыі вялікадзяржаўных ухілістаў, выступленьне Югава, які аказаўся перазброеным трацкістам, з падзелам камуністаў па адзнаках іх нацыянальнасьці, што «стварала антаганізм і прывяло да напружаных нетаварыскіх адносін да асобных беларускіх работнікаў» (з пастановы ЦК і ЦКК КП(б)Б). Мы маем аслабленьне работы па беларусізацыі ў асобных зьвеньнях КП(б)Б. Мелі месца яўныя вялікадзяржаўніцкія вылазкі на асобных прадпрыемствах.

Вось чаму ЦК і ЦКК КП(б)Б усім сваім часова падкрэсьліваюць задачу «... павысіць пільнасьць да вылазак і праяўленьняў вялікадзяржаўнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на дадзеным этапе, і арганізаваць яшчэ больш актыўную барацьбу з ім, наносячы рашучы ўдар па апартуністычным і абывацельскім прымірэнцтве да вялікадзяржаўнага ўхілу».

(Працяг на 3 старонцы).

Гэты-ж артыкул адначасова друкуецца ў часопісе «Бальшавік Беларусі».

*) Канец. Пачатак гл. у № 16 (4268).

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Справаздача Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б

З дакладу сакратара гаркому КП(б)Б т. Кавальчука на II гарпартканфэрэнцыі

Менская партыйная арганізацыя прышла да сваёй другой канфэрэнцыі з значнымі посьпехамі ў галіне прамысловасьці сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі прыгараднага раёну і нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Гэтыя посьпехі дасягнуты на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня ленінскай генэральнай лініі, бязьлітаснай барацьбы супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, «лявацкіх» загібаў і прымірэнцтва.

Важнейшым лёзунгам у рабоце Менскай арганізацыі як і ўсёй партыі быў лёзунг выкананьня пяцігодкі за чатыры гады. Над ажыцьцяўленьнем гэтага лёзунгу наша партыйная арганізацыя працавала ўперта, па-бальшавіцку.

Работа прамысловасьці

Валавая прадукцыя гарадзкой прамысловасьці, у параўнаньні з 1930 г., узрасла на 50,9 проц. і выявілася ў суме 12.733 тыс. руб.

З году ў год растуць капітальныя ўкладаньні ў гарадзкую прамысловасьць. У 1930 г. яны складалі 5.359.000 р., а ў 1931 г.—7.552.000 рублёў.

У рэзультаце — рад прадпрыемстваў, якія ў мінулым былі паўсаматужнымі, зараз, дзякуючы праведзенай рэканструкцыі, ператварыліся ў буйнейшыя сацыялістычныя прадпрыемствы. Адзін той факт, што звыш 10 менскіх прадпрыемстваў налічваюць больш чым па 1.000 рабочых, гаворыць аб вялікім узбуйненьні нашых фабрык і заводаў.

Партыйная арганізацыя, узначальваючы творчую актыўнасьць рабочых мас, дабілася ахопу сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам 71 проц. усіх рабочых.

Рост творчага энтузіязму рабочых мас даў магчымасьць раду менскіх прадпрыемстваў датэрмінова скончыць свой пяцігадовы плян. Да такіх перадавікоў адносіцца фабрыка «Кастрычнік», імя Варбускага і набліжаецца да сканчэньня свайго пяцігадовага пляну завод «Бальшавік». Перавыканалі 10-месячнае заданьне фабрыка імя Крупскай, завод імя Молатава, друкарня імя Сталіна і інш.

Работа, якую разгарнула партыйная арганізацыя па правядзеньні ў жыцьцё 6 умоў т. Сталіна, выклікала новую хвалю творчай актыўнасьці рабочых мас.

На швацкай фабрыцы гаспадарча-разрахунковая брыгада дала эканоміі звыш пляну больш чым на 3 тыс. рублёў. На заводзе «Бальшавік» брыгада дабілася эканоміі апалу на 2 тыс. руб. і г. д.

За апошні год ёсьць значнае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых гораду. Рост зарплаты ў сярэднім складае 11 проц. Сярэдні дзённы заработак рабочага складае 4 р. 5 кап. У гэтым годзе [illegible] новыя сталовыя на заводах «Дрэваапрацоўшчык» і «Камунар», на радзе прадпрыемстваў пашыраны старыя. Праз дамы адпачынку ў 1931 г. прапушчана 6 тыс. рабочых.

У сувязі з перабудовай работы спажывецкай кааперацыі і арганізацыяй закрытых рабочых кааператываў, значна палепшылася забесьпячэньне рабочых, асабліва вядучых галін прамысловасьці.

Побач з тымі посьпехамі ў галіне прамысловасьці, якіх дабілася Менская арганізацыя, неабходна спыніцца на недахопах нашай работы. Ня гледзячы на тое, што валавая прадукцыя прамысловасьці гораду ў параўнаньні з 1930 г. павялічылася на 50,9 проц., усё-ж вытворчы плян ня выкананы. За 10 месяцаў па ўсёй прамысловасьці гораду плян выкананы толькі на 86,6 проц., а гадавы плян за 10 месяцаў выкананы на 66,2 проц. Гэта недавыкананьне прамфінпляну ў пераводзе на грошы азначае, што прамысловасьць недадала прадукцыі дзяржаве на 17 млн. руб.

Недавыкананьне пляну тлумачыцца галоўным чынам слабым правядзеньнем у жыцьцё 6 умоў т. Сталіна радам нашых прадпрыемстваў. У рабоце раду нашых гаспадарчых кіруючых органаў адсутнічае гібкасьць і ініцыятыва па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, па замене дэфіцытных матар'ялаў і г. д.

Дырэктыва партыі аб зьніжэньні сабекошту ня менш як на 8 проц. ня выканана. Сабекошт зьніжаны толькі на 1,8 проц. На мясцовай прамысловасьці нават ёсьць рост сабекошту на 1 проц.

Галоўная прычына невыкананьня заданьня па зьніжэньні сабекошту заключаецца ў тым, што ў радзе прадпрыемстваў ёсьць лішняя рабочая сіла, што ёсьць значныя прастоі з-за ўнутраных непаладак, што слаба вядзецца барацьба за ўзьняцьце працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах. Аб гэтым сьведчыць тое, што за 10 месяцаў было 16.484 чалавека-дні прагулу па няўважлівых прычынах.

Задача зьніжэньня сабекошту ў рабоце прамысловасьці павінна стаць адной з важнейшых задач у рабоце Менскай арганізацыі.

Яшчэ горш стаіць справа з якасьцю прадукцыі. Радам канкрэтных фактаў аб прадукцыі фабрык «Кастрычнік», «Беларуска», абутковай і інш. тав. Кавальчук паказвае на тыя недахопы, якія яшчэ ёсьць у гэтай галіне.

Пытаньне павінна быць пастаўлена так, каб і па лініі партыйных арганізацый, і па лініі прафсаюзных і савецкіх арганізацый быў абвешчан паход за якасьць прадукцыі.

Невыстарчальна яшчэ разгортваецца барацьба за аўладаньне тэхнікай.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — у цэнтр увагі

Менская партарганізацыя дабілася буйнейшых посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі прыгараднага раёну. У асноўным завершана суцэльная калектывізацыя (68 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і 76 проц. пасеўнай плошчы ахоплена калгасамі). На падставе гэтага завяршаецца ліквідацыя кулацтва як клясы. Пасеўная плошча супроць 1930 г. пашырылася на 16.297 га.

У выніку спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі рэзка зьмяніўся характар сельска-гаспадарчай вытворчасьці Менскага раёну, як раёну гароднія-бульбяна-малочнага. Супроць 1930 г. пашырана плошча пад гароднімі культурамі на 94,1 проц. У 1931 г. арганізавана 60 малочных таварных ферм у калгасах і 10 ферм у саўгасах з агульнай колькасьцю 6 тыс. кароў. Сельская гаспадарка прыгараднага раёну ўжо ў мінулым годзе дала гораду каля 10 тыс. тон гародніны, больш 1 тыс. тон садавіны, каля 16 тыс. тон бульбы і звыш 5 тыс. тон малака.

Наша задача ў гэтым годзе — узяць больш рашучы курс на правядзеньне спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі раёну.

Рэалізацыя пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб фарсаваньні разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі набывае выключнае значэньне для нашага раёну, як раёну гароднія-малочнага. Хоць у гэтай галіне і ёсьць некаторыя посьпехі (за гэты год статак сьвіней павялічыўся ў абсалютных лічбах на 7.248 шт., ці на 38,8 проц., а буйной рагатай жывёлы — на 1.020 штук, ці на 4 проц.), аднак, гэтыя посьпехі зьяўляюцца невыстарчальнымі, тым больш, што асноўны рост рагатай жывёлы ідзе за лік цялят і нецеляў. Што датычыць дойных кароў, дык за апошні год нагляддаецца зьмяншэньне іх. Рад арганізацый ня выканалі пляну па ўкамплектаваньні жывёлы. Напрыклад, па сыстэме Белсаўгастрэсту плян камплектаваньня выкананы толькі на 79,5 проц., па сыстэме Белкаапсаюзу—на 42,3 проц.

Яшчэ горш стаіць справа з выкананьнем плянаў камплектаваньня па Сьвінаводтрэсьце (34,2 проц.).

Цэнтральнай задачай партарганізацыі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі прыгараднага раёну зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Паказаўшы на асобныя памылкі, якія дапусьціў гарком КП(б)Б у пытаньні аб тэмпах калектывізацыі, якія былі своечасова выпраўлены, тав. Кавальчук заастрае ўвагу канфэрэнцыі на неабходнасьці рашучай самаачысткі калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў.

Усе пастаўленыя задачы ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў могуць быць з посьпехам выкананы толькі на падставе ажыцьцяўленьня 6 умоў т. Сталіна ва ўмовах сельскай гаспадаркі.

Менск павінен паказаць узор рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі

У галіне камунальнай гаспадаркі Менск мае значныя посьпехі. Пабудаван трамвай, рад новых дамоў, пашырэна электрычная сетка і водазабесьпячэньне.

Аднак, ва ўмовах шпаркіх тэмпаў разьвіцьця прамысловасьці і росту рабочай клясы, гэтыя посьпехі не забясьпечваюць узрастаючых запатрабаваньняў.

Тэмпы росту жыльлёвага будаўніцтва значна адстаюць ад росту насельніцтва гораду. Ня гледзячы на тое, што на працягу 1931 г. пабудован рад вялікіх дамоў, жылая плошча на аднаго жыхара ўсё-ж зьменшылася. У 1929 годзе жылая плошча на аднаго жыхара складала 5,64 кв. мэтра. У 1930 г. — 5,77 кв. м., а ў 1931 г. — 5,66 кв. м. Недавыкананьне пляну 1931 г. па жыльлёвым будаўніцтве на 60 проц. яшчэ больш павялічыла вострасьць жыльлёвага пытаньня.

Прычыны невыкананьня пляну жыльлёвага будаўніцтва заключаюцца ў тым, што рад будаўнічых арганізацый (Белжылсаюз і інш.) не скарысталі мясцовых будаўнічых матар'ялаў і не разгарнулі своечасова будаўніцтва стандартных дамоў.

У справе вырашэньня жыльлёвага пытаньня вялікае значэньне мае разгрузка Менску ад раду ўстаноў, якія павінны быць пераведзены ў іншыя гарады БССР. Зараз створана пры СНК БССР спэцыяльная камісія па разгрузцы гораду.

СНК і бюро ЦК КП(б)Б вынеслі спэцыяльную пастанову аб становішчы камунальнай гаспадаркі Менску. Рэалізацыя гэтай пастановы ператворыць Менск у сапраўды ўзорную сталіцу БССР. За гэта трэба змагацца.

Адзначыўшы некаторыя посьпехі ў рабоце Менскага чыгуначнага вузла тав. Кавальчук гаворыць:

Задача поўнага паляпшэньня работы Менскага вузла павінна стаць справай усёй партыйнай арганізацыі і ў першую чаргу чыгуначнай. Менск павінен паказаць узор усім іншым вузлом БССР, як трэба выконваць дырэктывы партыі і ўраду аб падцягваньні транспарту на ўзровень перадавых галін народнай гаспадаркі.

Пытаньні перабудовы кааперацыі

На аснове рэалізацыі майскай адозвы ЦК і СНК аб перабудове менская кааперацыя дасягнула некаторых посьпехаў у сваёй рабоце. За 10 месяцаў павялічыўся лік пайшчыкаў на 16.050 чал. па горадзе і на 14.173 чал. па вёсцы. Каапэраваньне насельніцтва гораду дасягнула 77 проц. (сюды не ўваходзяць дзеці да 4-х год і асобы, якія абслугоўваюцца закрытымі ваенкаапэратывамі).

Паявы капітал на спажыўкааперацыі за 1931 год павялічыўся на 1.035 000 руб., ці на 63,4 проц. агульнага паявога капіталу.

Значна павялічыўся таваразварот. У 1930 г. таваразварот раўняўся 45 млн. руб., у 1931 г. за 10 месяцаў ён вырас супроць 1930 г. на 25 проц.

Вырасла і гандлёвая сетка. На 1-га студзеня 1931 г. яна па горадзе складалася з 245 адзінак, а на 1 лістапада 1931 г.—з 294 адзінак. Сталовых на 1 студзеня 1930 г. было 67, а на 1 лістапада 1931 г.—91.

На буйнейшых прадпрыемствах Менску арганізавана 8 ЗРК. Іх арганізацыя наблізіла работу кааперацыі да рабочых мас.

Ёсьць і значныя недахопы ў рабоце спажывецкай кааперацыі, на перамаганьне якіх неабходна мабілізаваць усю партыйную арганізацыю, усіх работнікаў кааперацыі. Усё яшчэ ня зьнішчана косасьць і бюрократызм у рабоце кааперацыі і Дзяржгандлю. Праведзеная праверка выявіла скажэньні палітыкі цэн у рабоце раду кааператываў і магазынаў Дзяржгандлю. Белкаапсаюз і Наркамснаб не прынялі належных мер да ўстанаўленьня прэйскурантных цэн, норм накідак і г. д.

Яшчэ дрэнна пастаўлена абслугоўваньне рабочых акраін. З усёй сеткі магазынаў, якія ёсьць па горадзе, 61 проц. прыпадае на цэнтральную частку.

Па гэтай тэндэнцыі адкрываць магазыны толькі на цэнтральных вуліцах, ігнаруючы рабочыя акраіны, гарком рашуча ўдарыў.

У справе паляпшэньня забесьпячэньня рабочых мас важнейшую ролю адыгрываюць самазагатоўкі. Між тым, самазагатоўкі яшчэ не занялі таго месца ў рабоце ЗРК, ЦРК ТПО, якое ім належыць.

Прафсаюзы. Камсамол

Неабходна адзначыць значнае паляпшэньне масавай работы прафсаюзаў. Павысілася роля і ўдзел прафарганізацый у правядзеньні важнейшых гаспадарча - палітычных кампаній. Тыя посьпехі, якія ёсьць у галіне разьвіцьця сацспаборніцтва і ўдарніцтва, у галіне разгортваньня добраахвотнага руху па арганізацыі гаспадарча - разрахунковых брыгад, у галіне аўладаньня тэхнікай і рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, у вялікай ступені дасягнуты пры дапамозе і непасрэдным удзеле прафсаюзных арганізацый.

Менская камсамольская арганізацыя мае значнае паляпшэньне ў сваёй рабоце. Павысіўся яе ўдзел у барацьбе за выкананьне вытворчых плянаў і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

За апошнія 11 месяцаў камсамольская арганізацыя Менскага раёну вырасла на 8.615 чалавек. Важнейшай задачай зьяўляецца выхаваньне ў бальшавіцкім духу гэтага новага папаўненьня. З усёй рашучасьцю неабходна палепшыць партыйнае кіраўніцтва нізавымі зьвеньнямі камсамольскай арганізацыі.

Побач з агульнымі дасягненьнямі, якія мае камсамольская арганізацыя ў горадзе, вясковая камсамольская арганізацыя прыгараднага раёну яшчэ не перабудавала сваёй работы.

Адной з важнейшых задач гарадзкога камсамолу зьяўляецца перадача свайго вопыту і дапамога ў рабоце вясковай камсамольскай арганізацыі.

Праведзеньне гаспадарча-палітычных кампаній

Заастрыўшы ўвагу на пытаньні ўзмацненьня ваеннай работы, тав. Кавальчук спыняецца на становішчы выкананьня загатовак і пляну мабілізацыі сродкаў.

Кампанія загатовак,—гаворыць тав. Кавальчук, — адбываецца ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня. Кулацтва ўжывае ўсе меры, каб сарваць выкананьне пляну загатовак. Кулацкі ўплыў знайшоў свой адбітак у пасобных зьвеньнях нізовага апарату. З боку кіраўнікоў раду саўгасаў і калгасаў мелі месца разважаньні аб нерэальнасьці плянаў загатовак, праяўлены спажывецкія тэндэнцыі.

Гарком КП(б)Б і гарадзкая кантрольная камісія моцна ўдарылі па буржуазных, кулацкіх, спажывецкіх тэндэнцыях, выключыўшы з партыі рад кіраўнікоў калгасаў (Барысэвіч, Нячай і інш.).

За апошні час назіраецца пэўны пералом у ходзе збожжазагатовак. Аднак, нельга сказаць, што мы поўнасьцю справіліся з пастаўленай задачай. На 10 студзеня выкананы гадавы плян па збожжы толькі на 86 проц., па ільнасемі—на 94 проц., па мясе (плян 4-га квартала) — на 79 проц. План па бульбе выкананы на 101.

Задача ўсёй партарганізацыі заключаецца ў тым, каб у бліжэйшыя дні ва што-б там ні стала скончыць выкананьне плянаў загатовак па збожжы, мясе, ільнасемі.

Нацыянальна-культурнае будаўніцтва

Няўхільна ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, Менская арганізацыя мае рад буйнейшых посьпехаў на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

У асноўным ліквідавана няпісьменнасьць у горадзе. Уведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе сямігодкі. Сетка вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў Менску вырасла да 27 адзінак. У іх навучаецца больш 6 тысяч моладзі.

Значна выраслі бюджэтныя асыгнаваньні на народную асьвету. У бягучым годзе рост бюджэтных асыгнаваньняў супроць 1929-30 г. складае 126,4 проц.

Ёсьць бясспрэчны рост беларускай пралетарскай літаратуры і мастацтва, а таксама пралетарскай літаратуры і мастацтва нацменшасьцяй.

Пералічыўшы рад канкрэтных фактаў праяўленьняў ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, вялікадзяржаўніцкіх вылазак (завод «Камунар», Дзяржкіно, фабрыка «Беларуска», Электраб'яднаньне і Белдзяржбуд), а таксама факты беларускага і яўрэйскага шавінізму ў Белдзяржкіно, тав. Кавальчук заастрыў увагу арганізацыі на ўзмацненьні барацьбы з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекі, ухілам у бок беларускага, яўрэйскага і іншых шавінізмаў і з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам.

Нельга зводзіць справу беларусізацыі выключна да вывучэньня беларускай мовы. Мы павінны дабіцца, каб уся арганізацыя аўладала беларускай пралетарскай культурай, паставіць як сьлед работу па вывучэньні гісторыі і эканомікі Беларусі, яшчэ больш шпаркімі тэмпамі разьвіваць беларускую пралетарскую літаратуру і мастацтва, а таксама пралетарскую літаратуру і мастацтва нацменшасьцяй на іх роднай мове.

Гаворачы аб барацьбе за павышэньне тэарытычнага ўзроўню партыйнай арганізацыі ў сувязі з лістом тав. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарская революция», тав Кавальчук гаворыць: Менская арганізацыя зьяўляецца ідэалёгічна здаровай, яна цьвёрда праводзіць генэральную лінію партыі. Задача ўсёй партыйнай арганізацыі, а таксама і камсамольскай — яшчэ больш павысіць свой тэарытычны ўзровень.

Менская партарганізацыя налічвае ў сваіх радох 11 тыс. членаў. За 9 месяцаў арганізацыя ўзрасла на 2 тыс. чалавек. Бальшавіцкае выхаваньне новых кадраў арганізацыі павінна заняць важнейшае месца ў рабоце ячэек і парткалектываў. Зараз сеткай партасьветы ахоплена 8.050 чал. Гэта лічба ні ў якім разе нас ня можа задаволіць. Зусім дрэнна пастаўлена вучоба актыву. Неабходна ў бліжэйшыя дні дабіцца крутога пералому ў справе 100-проц. ахопу партвучобай усіх членаў і кандыдатаў партыі.

Менская арганізацыя па - бальшавіцку выкрыла трацкісцкага кантрабандыста Югава і выключыла яго з партыі, як двурушніка, які, знаходзячыся ў радох партыі, ня толькі не разброіўся, а працягваў на тэарытычны фронт ідэалёгію контр - рэвалюцыйнага трацкізму. Арганізацыя таксама ўдарыла і па допушчаных праяўленьнях гнілога лібэралізму з боку раду таварышоў.

Пры абгавараньні ліста тав. Сталіна мелі месца і некаторыя няправільныя імкненьні з боку асобных таварышоў. Яны лічылі, што трэба ўдарыць па ўсіх тых таварышох, якія калісьці былі трацкістамі і якія зараз на практычнай рабоце даказалі сваю адданасьць лініі партыі і выправілі допушчаныя ў свой час памылкі. Гэта няправільны погляд. Задача заключаецца ў тым, каб, рашуча выкрываючы памылкі трацкісцкага парадку і выганяючы са сваіх радоў двурушнікаў, даць магчымасьць тым таварышом, якія рабілі памылкі, усьвядоміць іх і даць гэтым таварышом магчымасьць выправіць допушчаныя памылкі.

Менская арганізацыя прышла на сваю партыйную канфэрэнцыю з вялізарнейшымі посьпехамі. Яны дасягнуты ў бязьлітаснай барацьбе на два франты—супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі, супроць «левага» ўхілу і прымірэнства да ўхілаў ад лініі партыі, супроць розных адхіленьняў ад ленінскай лініі ў нацыянальным пытаньні, з тонкамі супроць кантрабанды контр-рэвалюцыйнага трацкізму і гнілога лібэралізму. Менская арганізацыя—пасланы атрад КП(б)Б ідзе да XIV зьезду КП(б)Б і XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі маналітнай, згуртаванай на аснове генэральнай лініі партыі. (Аплядысмэнты).

Разглядаючы пытаньне аб нацыянальна-культурным будаўніцтве, трэба спыніцца і на тых памылках, якія былі допушчаны ў гэтай галіне. У радзе артыкулаў, зацьверджаных ЦК у 1929 годзе і пачатку 1930 г., у рэзалюцыі XIII зьезду КП(б)Б па дакладу аб прафсаюзах, пры правядзеньні правільнай барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, быў прыняты памылковы лёзунг аб тым, што беларускі нацыянал-дэмакратызм зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе. «Памылковасьць лёзунгу аб нацыянал-дэмакратызме, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, заключалася ў тым, што гэты лёзунг не канцэнтраваў галоўнага агню супроць вялікадзяржаўнага ўхілу і тым самым не садзейнічаў неабходнай мабілізацыі партыйных сіл на барацьбу з ім» (з пастановы ЦК і ЦКК).

Гэты лёзунг супярэчыў пастановам XII зьезду РКП(б) і XVI зьезду УсеКП(б) і зараз-жа пасьля XVI зьезду быў выпраўлен. КП(б)Б зараз-жа пасьля XVI зьезду прыняла ўстаноўку аб тым, што вялікадзяржаўны ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, мабілізуючы ўвагу на рашучай барацьбе з ім.

ЦК зусім правільна ў сваёй пастанове адзначае, што «наяўнасьць на пэўным этапе няправільнага лёзунгу аб тым, што нацыянал-дэмакратызм зьяўляецца галоўнай небясьпекай, не дае ніякіх падстаў рэвізаваць праведзеную ЦК КП(б)Б барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам. Выкрыцьцё і барацьба супроць нацыянал-дэмакратызму і яго агентуры ў радох партыі — нацыянал-апартунізму былі праведзены кампартыяй Беларусі зусім правільна».

У далейшай практычнай рабоце па нацыянальна-культурным будаўніцтве нам неабходна разгарнуць самую непрымірымую барацьбу за правільнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі; ліквідаваць адставаньне культурнага фронту ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба рашуча змагацца з недаацэнкай работы сярод нацменшасьцяй, значна палепшыўшы гэту работу. Узмацніць справу беларусізацыі апаратаў і асабліва сярод рабочых мас, не абмяжоўваючыся толькі вывучэньнем беларускай мовы, а дабівацца таго, каб партарганізацыі і рабочая маса аўладалі ўсім працэсамі нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Неабходна змагацца за ператварэньне БССР да 1 мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці, за поўнае выкананьне плянаў абавязковага навучаньня, змагацца за паляпшэньне якасьці ва ўсёй рабоце масавых школ і рашучую іх перабудову.

Трэба дабіцца ўмацаваньня работы БАН, інстытуту гісторыі партыі, навукова-дасьледчых і навучальных устаноў. Трэба змагацца за пасьпяховае вырашэньне задачы стварэньня сваіх пралетарскіх кадраў, адначасова лепш скарыстоўваючы тую частку старой навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі, якая сумленна аддае свае сілы на справу сацыялістычнага будаўніцтва.

**

КП(б)Б у рашучай барацьбе на два фронты, з правым і «левым» апартунізмам, у барацьбе з ухіламі ў нацыянальным пытаньні, з прымірэнцтвам да ўхілаў і скажэньняў лініі партыі расла і загартоўвалася, значна перамагла элемэнты групоўшчыны ў частцы актыву, ускрытыя ў сувязі з разгромам нацдэмаўшчыны. Час з XIII зьезду КП(б)Б знаменуе сабою яшчэ большую згуртаванасьць радоў КП(б)Б на аснове генэральнай лініі партыі. На канкрэтных фактах барацьбы з праяўленьнямі апартунізму загартоўваліся і выхоўваліся новыя папаўненьні партыі.

ЦК КП(б)Б рашуча ўдарыў па праяўленьнях правага апартунізму, які мае месца ў пасобных раёнах у даволі шырокіх размерах. Такія праяўленьні былі рашуча выкрыты ў свой час у Гарадоцкім раёне, дзе правы апартунізм пачынаў пераплятацца з «левымі» загібамі, у Касьцюковіцкім раёне, [illegible] і інш. раёнах. ЦК рашуча ўдарыў па праяўленьнях правага апартунізму ў правядзеньні загатовак, зьняўшы кіраўніцтва раду раёнаў і Белсельтрэсту. ЦК рашуча выкрыў і ўдарыў па праяўленьнях «левых» загібаў, якія мелі месца і шырокае распаўсюджаньне ў Койданаўскім, Кармянскім, Лельчыцкім, Бягомльскім, Чырвонапольскім раёнах.

У выніку ўзмацненьня аўтарытэту партыі сярод шырокіх рабочых мас і ўздыму іх актыўнасьці павысіліся тэмпы росту КП(б)Б. За час пасьля XIII зьезду КП(б)Б узрасла з 41.347 (на 1 ліпеня 1930 г.) да 54.392 (на 1 кастрычніка 1931 г.).

Новая абстаноўка і новыя задачы патрабавалі і адпаведнай перабудовы партыйнай работы. Своечасова напомніць паказаньні X зьезду РКП(б) аб тым, што «усякая арганізацыйная форма і адпаведныя мэтады работы могуць са зьменай аб'ектыўных умоў разьвіцьця рэвалюцыі ператварыцца з формы разьвіцьця партыйнай арганізацыі ў аковы гэтага разьвіцьця».

Перабудова партыйнай работы праходзіла пад знакам устанаўленьня сапраўднай канкрэтызацыі і апэратыўнасьці ў кіраўніцтве, стварэньня сапраўднага павароту партыйных арганізацый тварам да канкрэтна-гаспадарчых задач і забесьпячэньня авангарднай ролі камуністаў на вытворчасьці. Адсюль перанясеньне цэнтру партыйнай работы непасрэдна ў нізавое зьвяно (цэх, брыгаду), ператварэньне партыйных ячэек саўгасаў, МТС і калгасаў у апорныя пункты партыйнай работы на вёсцы, устанаўленьне сапраўднай спэцыялізацыі і апэратыўнасьці ў раённым партыйным кіраўніцтве, перабудова работы партапарату.

Перабудова партыйнай работы далёка яшчэ ня скончана і не разгорнута ў належнай ступені ва ўсіх зьвеньнях партарганізацыі. У шмат якіх партыйных ячэйках перабудова праведзена фармальна. Камуністы па вытворчасьці ня ўсюды адыгрываюць авангардную ролю. Канкрэтныя гаспадарчыя пытаньні не заўсёды стаяць у цэнтры ўвагі партыйных ячэек.

Неабходна завяршыць перабудову партработы, удасканальваючы ўвесь час яе формы і мэтады, пераносячы сапраўдны цэнтр партработы непасрэдна ў нізавое зьвяно (цэх, брыгада, зьмена, агрэгат, калгас), устанавіць сапраўды гібкае і апэратыўнае кіраўніцтва. Трэба рашуча зьнішчаць праяўленьні супраціўленьня перабудове партыйнай работы. Неабходна ў новых умовах сапраўды «па-новаму кіраваць, па-новаму працаваць», згуртаваўшы вялізарную ўвагу на правільным падборы і расстаноўцы кадраў па ўсіх вучастках нашай работы.

Важнейшай і неадкладнай задачай зьяўляецца ўмацаваньне ўсіх зьвеньняў вясковай партыйнай арганізацыі. Ад пасьпяховага вырашэньня гэтага будзе залежыць у значнай меры пасьпяховае вырашэньне задач, што стаяць перад вясковай партыйнай арганізацыяй.

Новая абстаноўка і задачы патрабавалі адпаведнай перабудовы работы і масавых арганізацый пралетарыяту. Дасягнуты значныя вынікі ў перабудове работы прафсаюзаў. Ёсьць пералом у рабоце прафсаюзаў тварам да вытворчасьці. Прафсаюзы прыступілі да ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна. Узбуйненьне прафсаюзаў спрыяла іх павароту тварам да канкрэтных задач вытворчасьці. Аднак, прафсаюзы, як школа камунізму, не разгарнулі яшчэ шырокім фронтам масавай палітычна-выхаваўчай работы. У наяўнасьці яшчэ рад буйнейшых недахопаў.

Камсамол таксама дабіўся значных дасягненьняў у сваёй рабоце. Узьнялася вытворчая актыўнасьць камсамолу. Камсамольцы больш актыўна і канкрэтна прымаюць удзел у барацьбе за выкананьне прамфінпляну на прадпрыемствах, за ўмацаваньне калгасаў.

Аднак, у рабоце камсамолу ёсьнуе адставаньне ў радзе важнейшых вучасткаў работы. Тэмпы перабудовы работы невыстарчальныя. Далейшая перабудова работы камсамолу і канцэнтрацыя галоўнай увагі на бальшавіцкім выхаваньні камсамольцаў і новых напаўненьняў рабочай і працоўнай моладзі — вось асноўная задача камсамолу.

Перабудова работы ўсіх масавых арганізацый пралетарыяту разгарнута, але яшчэ не дасягнула таго ўзроўню, які-б адпавядаў вучэбным задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

Пытаньні якасьці ў кіраўніцтве і рабоце партыйных, савецкіх і прафсаюзных органаў, канкрэтнасьць і перанясеньне цэнтру цяжару на праверку выкананьня — набылі выключнае значэньне. Перабудова работы ўсіх арганізацый пачынала зьвязвацца з разгортваньнем далейшай бязьлітаснай барацьбы з бюракратызмам. Гэтай задачы нельга ні ў якім разе ўпускаць у далейшай рабоце.

Трэба ўзьняць адказнасьць [illegible] арганізацый, рашуча біць па расхлябанасьці, несваячасовым выкананьні дырэктыў партыі, калі-б гэта ня датычыла.

**

Асноўнай умовай будаўніцтва сацыялізму і выкананьня пастаўленых задач зьяўляецца няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі ў бязьлітаснай барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай унутры партыі—правым і «левым» апартунізмам, з прымірэнцтвам да іх. Зараз на новым этапе разьвіцьця мы маем праяўленьне апартунізму ў новых формах. Перад тварам бліскучых перамог лініі партыі ворагі рабочай клясы і іх агентура ў партыі ўжываюць усё больш скрытыя, замаскаваныя формы атак на партыю, на яе генэральную лінію і кіраўніцтва. «Адкрыта пад сьцягам трацкізму выступаць цяпер рызыкоўна, бо не завабіш, капіталу не выкажаш». Выступаць трэба пад іншымі сьцягамі, лёзунгамі, тэзісамі, фармулёўкамі. Трэба пастаянна [illegible] пасьлядоўнай ленінскай тэорыі, каб [illegible] канкрэтную практыку ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Апартунізм [illegible] зараз у [illegible] роды, прыкрываючыся, прымазваючыся, упрыгожваючыся, прыстасоўваючыся да жыцьця, патрабуе практычнай [illegible] у пачынах і асабліва патрабуе [illegible] нашай гісторыі» (Л. Н. Кагановіч).

Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісу «Пролетарская революция», выяўляючыся дакумантам выключнай палітычнай важнасьці, паставіў з усёй вострасьцю пытаньне аб [illegible] партыйнасьці да трацкісцкай кантрабанды і гнілога лібэралізму на ўсіх вучастках работы нашай партыі, паставіў пытаньне аб бальшавіцкім выхаваньні кадраў па сапраўднаму, у ленінскім разуменьні гэтага слова, гісторыі партыі.

Ліст тав. Сталіна з выключнай вострасьцю паставіў пытаньне аб узьняцьці палітычнага ўзроўню тэарытычнага фронту да ўзроўню сапраўднай партыйнасьці ў навуцы. Ліст тав. Сталіна мае вялізарнае інтэрнацыянальнае значэньне для барацьбы брацкіх кампартый за большасьць рабочай клясы, барацьбы з контр-рэвалюцыйным трацкізмам, з люксэмбургіянствам і рэнэгатамі камунізму—сацыял-фашызмам.

Абгаварэньне ліста тав. Сталіна ўжо дало свае станоўчыя вынікі. У рэзультаце абгаварэньня ліста ўзьнялася на новую вышыню бальшавіцкая загартаванасьць усёй КП(б)Б. Галоўнай задачай тэарытычнага фронту зараз зьяўляецца перабудова работы ў адпаведнасьці з паказаньнямі тав. Сталіна. Актуальнасьць гэтай перабудовы тэарытычнага фронту БССР асабліва вялікая.

Літаратуры, якая-б правільна асьвятляла гісторыю бальшавізму і Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі, мы, фактычна, ня маем. Факты праніканьня ў гістарычную літаратуру БССР контр-рэвалюцыйнай кантрабанды, вялікадзяржаўных і нацыянал-дэмакратычных тэорый маюць значнае месца.

Палітычная бескляпотнасьць і гнілы лібэралізм некаторай часткі камуністаў дазволілі Югаву, неразброенаму трацкісту, скрываць да апошняга часу свой сапраўдны твар і працягваць у сваіх нават апошніх работах трацкісцкі паклёп і фальсыфікацыю.

Ідэалізацыя дробна-буржуазных і контр-рэвалюцыйных партый (Бунд, БОГ), ідэалізацыя люксэмбургіянства, асьвятленьне Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі, як рэвалюцыі сялянскай і інш. скажэньні гісторыі бальшавізму маюць месца ў радзе тэарытычных работ (Агурскі, Потапаў, Майзель, Шаўкатаў, Шчарбакоў і інш.), што зараз рашуча выкрываецца партыйнай арганізацыяй.

Трэба з пасьлядоўнай непрымірымасьцю змагацца за партыйнасьць навукі і марксысцка-ленінскую чыстату тэарытычнага фронту.

Прыток маладых кадраў, не прайшоўшых у большасьці сваёй школы [illegible] ня [illegible] капіталістычнай фабрыкі, а асобныя менш загартаваных,—з асаблівай вастрынёю ставіць пытаньне аб марксысцка-ленінскім выхаваньні партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных кадраў. Пасьпяховае вырашэньне гэтай задачы ставіцца ў простую залежнасьць ад выкананьня чарговых гаспадарча-палітычных задач і ўцягненьня да ўдзелу ў іх новых папаўненьняў партыі.

У галіне разгортваньня партыйна-выхаваўчай работы можна канстатаваць рад дасягненьняў. Аднак, гэтыя дасягненьні ў параўнаньні з усё ўзрастаючымі запатрабаваньнямі да партыйнай вучобы зьяўляюцца зусім невыстарчальнымі. У партвучобе бытуюць элемэнты схаластыкі, маюць месца скажэньні ідэалёгічнага зьместу вучобы, партвучоба невыстарчальна ўвязваецца з практыкай партыйнай работы і выкананьня чарговых палітычна-гаспадарчых задач. Ліквідацыя гэтых недахопаў павінна максымальна садзейнічаць узмацненьню бальшавіцкай вытрыманасьці ўсіх арганізацый КП(б)Б і павысіць яе баяздольнасьць у барацьбе за генэральную лінію партыі.

З асаблівым упорам ліст тав. Сталіна ставіць пытаньне аб павышэньні ідэйнага ўзроўню марксысцка-ленінскага выхаваньня членаў партыі і партыйнага актыву. Тэндэнцыі, якія маюць месца ў некаторых зьвеньнях партыйнай арганізацыі, — падмяніць задачу павышэньня якасьці ідэйна-выхаваўчай работы адміністраваньнем і спробай [illegible] трацкісцкай кантрабанды і яе носьбітаў з памылкамі партыйных таварышоў і адносінамі да [illegible] гэтых таварышоў у выпраўленьні іх памылак—павінны атрымаць рашучы адпор.

Ліст тав. Сталіна «мае вялізарнае значэньне, але ён ні ў якой ступені не дае такога напрамку, каб глыбокае вывучэньне ленінізму ў інтэнсіўную выхаваўчую работу пасобных ячэйка падмянілі адміністраваньнем. Гэта памылка тых арганізацый, якія так няправільна зразумелі сэнс і значэньне ліста тав. Сталіна. Трэба ўмець адрозьніваць асобную памылку чалавека ад сыстэмы поглядаў. Зразумела, скрытыя трацкісты ёсьць у радох нашай партыі. Але адна справа выкрываць [illegible] трацкістаў, якія [illegible] на тым ці іншым участку, выкрываць і выганяць іх з партыі, а другая справа — памылка таго ці іншага таварыша, якую таксама трэба крытыкаваць, але крытыкаваць трэба па-таварыску, каб ён мог выправіць яе. Трэба дапамагчы яму выправіць памылку і гэтым выхоўваць другіх. Няправільна [illegible] такога таварыша, як ухілісты. Тут справе гэтым не дапаможаш». (Пастышаў).

**

КП(б)Б, пад бальшавіцкім кіраўніцтвам свайго ЦК і ленінскага ЦК УсеКП(б), прайшла вялізарны шлях ад XIII да XIV свайго зьезду. Шлях посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, шлях перамог ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі. Бальшавіцкае кіраўніцтва ЦК КП(б)Б забясьпечыла вялізарны ўздым вытворчых сіл Савецкай Беларусі, сацыялістычную перабудову яе эканомікі, росквіт сапраўднай культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце.

Перамога сацыялізму ў БССР асабліва ярка выступае на фоне [illegible] пакутнага [illegible] прыгнётам фашысцкіх акупантаў працоўных мас Заходняй Беларусі. Вочы працоўных Заходняй Беларусі ўсё больш і больш накіроўваюцца на Савецкую Беларусь, якая паказвае свой [illegible] прыклад [illegible] на выхаду з бязвыходнага капіталістычнага крызісу, на вырашэньне [illegible] нацыянальнага пытаньня [illegible].

XIV зьезд КП(б)Б сваімі пастановамі асьвятліць шлях перамог ленінскага сацыялістычнага разьвіцьця Савецкай Беларусі і дапаможа брацкай КПЗБ у яе барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне працоўных Заходняй Беларусі. XIV зьезд КП(б)Б зьявіцца новай бліскучай старонкай барацьбы КП(б)Б за сацыялізм на аснове згуртаваньня сваіх радоў вакол генэральнай лініі партыі і яе ленінскага кіраўніцтва.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

Ленінскія дні адзначым узмацненьнем збожжазагатовак, поўным выкананьнем плянаў

Смалявічы ўключыліся ў праверку завяршэньня збожжазагатовак

СМАЛЯВІЧЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

РКК-РСІ І РАЁННАЯ ГАЗЭТА «ШЛЯХ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ» ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ПРАВЕРКУ ЗАВЯРШЭНЬНЯ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК І ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

ПА ГЭТЫХ ПЫТАНЬНЯХ ПРАВОДЗІЦЦА ЎНУТРЫРАЁННЫ РЭЙД, У ЯКІМ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ 50 АДКАЗНЫХ РАЁННЫХ РАБОТНІКАЎ І ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ-КАЛГАСЬНІКАЎ.

РАЙКОМ КП(б)Б У ДАДАТАК ДА МАБІЛІЗАВАНЫХ РАНЕЙ НА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ ТАВАРЫШОЎ НАКІРАВАЎ У СЕЛЬСАВЕТЫ ЯШЧЭ 16 АДКАЗНЫХ РАБОТНІКАЎ. К.

Чэрыкаўскі раён перавыканаў плян

ЦК КП(б)Б, СНК БССР, Наркамзябу, рэдакцыі газэты „Зьвязда"

Пад сталёвым кіраўніцтвам бальшавіцкага ЦК КП(б)Б, на аснове шырокага разгортваньня арганізацыйна - масавай работы сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, у рашучай барацьбе за чыстату генэральнай лініі партыі, з правым і «левым» апартунізмам і прымірэнствам да яго, ЧЭРЫКАЎСКІ РАЁН ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПЕРАВЫКАНАЎ. НА 14 СТУДЗЕНЯ ЗАМЕСТ 1.000 ТОН ЗАГАТОЎЛЕНА 1.002 ТОНЫ. Зараз вядзем барацьбу за пасьпяховае ажыцьцяўленьне высунутых сустрэчных плянаў.

Сакратар РК КП(б)Б КАЦМАН.
Старшыня РВК ГАРТКОЎ.

Чырвоным абозам вітаюць партканфэрэнцыю

ВІЦЕБСК. У ВІЦЕБСК ПРЫБЫЎ ЧЫРВОНЫ АБОЗ СА ЗБОЖЖАМ У ЛІКУ 40 ФУРМАНАК, АРГАНІЗАВАНЫ КАЛГАСАМІ ШУМІЛІНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ Ў ПАДАРУНАК 2-Й ГАРАДЗКОЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ І XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б. АБОЗАМ ЗДАНА 50 ЦЭНТН. ЗБОЖЖА, 11 ЦЭНТН. ІЛЬНАВАЛАКНА, 2 ЦЭНТН. ІЛЬНАНАСЕНЬНЯ І 5 ТОН САЛОМЫ.

Увага да загатовак аслабла

ВОРША. (БЕЛТА).

У апошнюю дэкаду процант выкананьня пляну збожжазагатовак узьняўся з 88,2% да 89,3 проц., па ільне — з 48,5 проц. да 52,4 проц., па сене—з 95,9 проц. да 96,1 проц., саломе — з 21 да 21,4 проц.

Такое слабае нарастаньне тэмпаў тлумачыцца выключна аслабленьнем увагі да загатовак з боку раду раённых арганізацый і асабліва сельсаветаў.

На пленуме Какоўшчынскага сельсавету выявілася, што дагэтуль да некаторых вёсак — Сяноцава, Колбава, Калашкова, нават не даведзены пляны.

Патрэбен рашучы зрух у рабоце як загатоўчых арганізацый, так і сельсаветаў. Раён павінен спаткаць XIV зьезд КП(б)Б поўным завяршэньнем збожжазагатовак.

Дабіцца канчатковай перамогі

СМАЛЯВІЧЫ. (Ад нашага спэцкора).

Уключыўшыся ў дэкаднік штурму і ва ўсебеларускі конкурс на лепшае завяршэньне збожжазагатовак, падхапіўшы ініцыятыву ўзаравіцкіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў, Смалявіцкі раён за апошні час дабіўся поўнага зруху ў ходзе кампаніі. Тэмпы збожжазагатовак павысіліся. Калі за 10 студзеня было загатоўлена па ўсім раёне 1,3 тоны збожжа, дык за 11 студзеня загатоўлена 6,5 тоны, 12 студзеня—7,8 тоны, 13 студзеня—7 тон.

Калгасьнікі нацыянальнага польскага калгасу «Орка» і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі вёскі Калюгі поўнасьцю выканалі заданьне па збожжазагатоўках і высунулі сустрэчныя пляны: калгас «Орка»—10 цэнт. збожжа, аднаасобнікі—8 цэнт. збожжа і 45 цэнт. сена.

Калгас імя Молатава, Смалявіцкага сельсавету, выканаў заданьне на 108 проц. Гэты калгас рэалізаваў таксама пляны па ўсіх іншых відах загатовак.

Калгасы Жажэлкаўскага сельсавету, выканаўшы з посьпехам плян здачы збожжа дзяржаве, узялі на сацыялістычны буксір аднаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі.

Дасягнуты пералом неабходна замацаваць і надалей яшчэ больш фарсаваць загатоўкі. Смалявіцкі раён мае ўсе магчымасьці ў бліжэйшыя дні завяршыць кампанію.

Трэба, каб раённыя арганізацыі і ў першую чаргу райкалгассаюз, а таксама адстаючыя сельсаветы ўзмацнілі аператыўнае кіраўніцтва, разгарнулі арганізацыйна-масавую работу і гэтым самым дабіліся канчатковай перамогі ў збожжазагатоўках.

Неабходна рашуча ўзмацніць націск на кулацка-заможныя гаспадаркі і прымусіць іх выканаць цьвёрдыя заданьні поўнасьцю. Да гэтага часу цьвёрдыя заданьні па раёне выкананы толькі на 60 проц. Я. К-ч.

Калгасы „Іскра рэвалюцыі" і „Чырвоны молат" па-бальшавіцку змагаюцца за выкананьне плянаў ільназагатовак

По прыкладзе перадавікоў разгарнуць пераапрацоўку і здачу валакна дзяржаве

Вышэй тэмпы

У часе падрыхтоўкі да 14 зьезду КП(б)Б рад раёнаў разгарнулі ўзмоцненую работу па пераапрацоўцы і загатоўках ільну.

Абвяшчаецца дэкаднік штурму. Пашыраецца ўзаемадапамога калгасаў, перадавікі бяруць на буксір адстаючыя калгасы.

Посьпехі, якія дасягнуты паасобнымі калгасамі, сельсаветамі, раёнамі павінны быць замацаваны, зроблены агульным здабыткам.

У ленінскія дні патрэбна дабіцца яшчэ больш шырокага разгортваньня пераапрацоўкі і загатовак ільну.

Прыклад калгасаў «Іскра рэвалюцыі», Полацкага раёну, і «Чырвоны молат», Лепельскага раёну, дзе пададжана сапраўднае аператыўнае кіраўніцтва пераапрацоўкай, праводзіцца штодзенны ўлік працы, дадзены выразныя заданьні, за выкананьне якіх брыгады змагаюцца на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва, — павінен быць падхоплен усімі калгасамі.

Змагацца за права рапартаваць XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі аб рашаючай перамозе ў ільназагатоўках — пад такім лёзунгам перадавікі вядуць барацьбу за хуткае скарачэньне пераапрацоўкі ільну і поўную здачу прадукцыі дзяржаве.

За гэта права павінны весьці барацьбу ўсе калгасы і бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў.

Перадавікі дапамагаюць адстаючым

ДУБРОЎНА. У ВЫНІКУ ШЫРОКА-РАЗГОРНУТАЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ І АРГАНІЗАЦЫІ БУКСІРНАЙ ДАПАМОГІ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ АДСТАЮЧЫМ ЛЯДНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ ПЛЯН ІЛЬНАЗАГАТОВАК ПЕРАВЫКАНАЎ НА 12 ПРОЦ.

КАЛГАСЫ «ПРАМЕНЬ», «МАЯК», «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», ІМЯ ШОСТАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ, «СВЕТАЧ САЦЫЯЛІЗМУ», САЗОНАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ЗАКОНЧЫЛІ ПЕРААПРАЦОЎКУ ІЛЬНУ І ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЛІ СВАЕ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ ПА ЗДАЧЫ (ПРОДАЖЫ) ІЛЬНАВАЛАКНА.

З ПОСЬПЕХАМ ВЫКОНВАЮЦЬ ПЛЯН І АДНААСОБНІКІ САЗОНАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ЯКІЯ ЗДАЛІ ДЗЯРЖАВЕ 302 ЦЭНТ. ВАЛАКНА, ШТО СКЛАДАЕ 78,6 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ.

ПРЫ СЕЛЬСАВЕЦЕ БЫЛА СКЛІКАНА НАРАДА КАЛГАСНАГА АКТЫВУ, НА ЯКОЙ ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ АБАВЯЗАЛІСЯ УЗЯЦЬ НА БУКСІР АДСТАЮЧЫЯ КАЛГАСЫ ІМЯ КІМ І «ХВАЛЯ РЭВАЛЮЦЫІ». КАЛГАСЬНІКІ АБАВЯЗАЛІСЯ ДАБІЦЦА, КАБ ДА XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б НЯ БЫЛО НІВОДНАГА КАЛГАСУ, ЯКІ-Б НЯ ВЫКАНАЎ ПЛЯНАЎ ІЛЬНАЗАГАТОВАК.

З 15-ГА ДА 25-ГА СТУДЗЕНЯ Ў РАЁНЕ АБВЕШЧАН ДЭКАДНІК ШТУРМУ ІЛЬНАЗАГАТОВАК. М.

Сацыялістычнымі мэтадамі працы

ЛЕПЕЛЬ. Рапартаваць XIV зьезду КП(б)Б аб поўным скончаньні пераапрацоўкі і здачы ільновалакна дзяржаве—такую задачу паставіў перад сабою калгас «Чырвоны молат», Латыголіцкага сельсавету. Гэты абавязак калгас ажыцьцяўляе з посьпехам.

Забясьпечана кругласутачная нагрузка мяльна-сушыльных пунктаў. Паміж брыгадамі шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Начныя і дзенныя зьмены заключылі паміж сабою дагаворы на поўнае выкананьне заданьняў і добраякасную апрацоўку. К. П.

Ільнамялкі—на дзьве зьмены

ПОЛАЦАК. КАЛГАС «ІСКРА РЭВАЛЮЦЫІ» ШПАКОЎШЧЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, УКЛЮЧЫЎСЯ ВА ЎДАРНЫ ШТУРМАВЫ ДЭКАДНІК ІЛЬНАЗАГАТОВАК, АБВЕШЧАНЫ Ў ПОЛАЦКІМ РАЁНЕ. ШЫРОКА АБГАВАРЫЎШЫ ГЭТА ПЫТАНЬНЕ, КАЛГАСЬНІКІ АРГАНІЗАВАЛІ ЎЗОРНЫЯ БРЫГАДЫ ПА АПРАЦОЎЦЫ ІЛЬНУ. КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ КРУГЛАСУТАЧНУЮ РАБОТУ, БРЫГАДЫ РАЗБІЛІСЯ НА ДЗЬВЕ ЗЬМЕНЫ — ДЗЕННУЮ І НАЧНУЮ.

КОЖНЫ ДЗЕНЬ ПРАЎЛЕНЬНЕМ КАЛГАСУ ПАДЛІЧВАЮЦЦА ВЫНІКІ РАБОТЫ БРЫГАД МЯЛЬШЧЫКАЎ І ТРАПАЛЬШЧЫКАЎ. АПРАЧА ГЭТАГА ВЫПУСКАЕЦЦА СПЭЦЫЯЛЬНАЯ ШТУРМАВАЯ НАСЬЦЕНГАЗЭТА ПА ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ.

КАЛГАСЬНІКІ АБАВЯЗАЛІСЯ ДА XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б РАПАРТАВАЦЬ АБ ПОЎНЫМ ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ ІЛЬНАЗАГАТОВАК. РАЗАМ З ГЭТЫМ КАЛГАС ПРАПРАЦАВАЎ ПЫТАНЬНІ ТРЭЦЯЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ І ВЫЛУЧЫЎ АДКАЗНЫХ БРЫГАДЗІРАЎ ПА РАМОНЦЕ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА ІНВЭНТАРУ І ПАДРЫХТОЎЦЫ НАСЕНЬНЯ.

У авангардзе ільна загатовак

СЯННО. Калгас «Ладзікава», Намайцянскага сельсавету, здаў дзяржаве 18 з пал. цэнт. ільнавалакна замест вызначаных плянам 17,5 цэнт., што складае 103 проц. гадавога пляну. Калгас «Расходна» здаў 25 цэнт. або 100 проц. пляну. Рад іншых калгасаў гэтага сельсавету таксама выканалі пляны загатовак.

Посьпехі калгасаў Намайцянскага сельсавету тлумачацца тым, што работа па пераапрацоўцы ільну была арганізавана на аснове зьдзельшчыны, шырока было разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва і ўся работа зьвязвалася з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў. К.

Хваля белага тэрору коціцца па ўсёй Польшчы

Паліцэйскія налёты на сталоўкі і кафэйні Варшаве

Сотні арыштаваных

ВАРШАВА, 18. Паводле паведамленьня «Кур'ера Варшаўскага» за апошнія дні ў Варшаве адбыліся масавыя вобыскі і арышты сярод асоб, западозраных у камуністычнай дзейнасьці. ЗАТРЫМАНА БОЛЬШ 100 ЧАЛ.

У сувязі з чаканымі дэманстрацыямі 15-га студзеня зроблены масавыя арышты і вобыскі сярод яўрэйскіх рабочых у Варшаве. АРЫШТНЫЯ ДАМЫ І НАВАТ КАЛІДОРЫ БЫЛІ ПЕРАПОЎНЕНЫ ЗАТРЫМАНЫМІ ЯЎРЭЙСКІМІ РАБОЧЫМІ І СЛУЖАЧЫМІ Ў ЛІКУ БОЛЬШ 200 ЧАЛ.

16-га студзеня ўвечары зроблена аблава ў адной сталоўцы. Пасьля вобыску ўсе прысутныя БОЛЬШ 100 ЧАЛ. БЫЛІ ЗАТРЫМАНЫ. Сталоўка апячатана. Моцны атрад паліцыі акружыў таксама памяшканьне адной кафэйні. Усе прысутныя ў ліку 50 ЧАЛ. АРЫШТАВАНЫ.

Аб масавых вобысках і арыштах паведамляюць таксама з САСНОЎЦУ (Дамброўскі басэйн). Арышты адбываюцца ў сувязі з узмацненьнем рэвалюцыйных выступленьняў і камуністычнай прапагандай, зьвязанай З ГАДАВІНАЙ СЬМЕРЦІ ЛЕНІНА І ЗАБОЙСТВАМ КАРЛА ЛІБКНЭХТА І РОЗЫ ЛЮКСЭМБУРГ. АРЫШТАВАНА 37 ЧАЛ. Канфіскавана многа камуністычнай літаратуры.

У КРАКАВЕ АРЫШТАВАНА 13 ЖАНЧЫН—удзельніц нелегальнага сходу па абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці. Сярод арыштаваных некалькі студэнтак Кракаўскага унівэрсытэту (ТАСС).

8.502 катаржныя прыгавары толькі за 9 месяцаў

ВАРШАВА, 18. На пасяджэньні бюджэтнай камісіі сойму выступіў польскі міністар унутраных спраў ПЯРАЦКІ.

У сваёй прамове ён спыніўся, галоўным чынам, на ПЫТАНЬНЯХ РОСТУ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ Ў ПОЛЬШЧЫ, а таксама на становішчы нацменшасьцяй і, у прыватнасьці, на становішчы Заходняй Украіны. Пяраці прывёў рад лічбовых даных, якія характарызуюць узмацненьне белага тэрору ў Польшчы. Паводле яго слоў колькасьць асоб, прысуджаных да турэмнага заключэньня ЗА КАМУНІСТЫЧНУЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ, складала ў 1928 г. 6.390 ЧАЛ., у 1929 г.—6.065 ЧАЛ., у 1930 г.—7.786 ЧАЛ., А ЗА 9 МЕСЯЦАЎ 1931 г.—8.502 ЧАЛ.

Усеагульная забастоўка трамваўшчыкаў у Лодзі

ВАРШАВА, 18. Учора ў Лодзі выбухнула ўсеагульная забастоўка трамвайшчыкаў. Забастоўкай кіруе забастовачны камітэт, выбраны на агульным сходзе рабочых. Прадстаўнікі згоднііцкага прафсаюзу трамвайшчыкаў зьнялі з сябе адказнасьць за забастоўку. (ТАСС).

НАПЯРЭДАДНІ ПРАЦЭСУ ТАРАШКЕВІЧА

ВІЛЬНЯ, 19. Праз некалькі дзён мінае год з таго часу, як польская дэфэнзыва па згодзе з нямецкай паліцыяй па-бандыцку схапіла на станцыі Тчэў у транзітным вагоне б. старшыню разгромленай фашызмам сялянскай Грамады—Браніслава Тарашкевіча.

Зараз віленскае манархічнае «Слово» ад 18 студзеня паведамляе, што сьледзтва ўжо скончылася і ў хуткім часе адбудзецца судовая расправа.

Год патрэбна было нават дэфэнзыўным «спэцам», каб «здабыць доказы віны» Тарашкевіча. Дэфензыве і пракуратуры трэба было ўжыць увесь свой спрыт і «веды», каб сфабрыкаваць Тарашкевічу акт абвінавачаньня. Зараз фашызм рыхтуе суровую расправу-помсту над правадыром Грамады, які не пайшоў на здраду беларускім працоўным масам, а застаўся верным нацыянальна-вызваленчаму руху.

У фабрыкацыі акту абвінавачаньня актыўны ўдзел прымалі і беларускія нацыянальна-фашысты—Луцкевічы, Астроўскія і К-°. Брудныя правакацыйныя даносы лідэраў беларускага нацыянал-фашызму на Тарашкевіча бязумоўна ляглі ў аснову акту абвінавачаньня.

Тарашкевіч сядзіць у Гарадзенскай турме і, як паведамляе «Слово», будзе знаходзіцца там да судовай расправы. Працэс Тарашкевіча выклікае сярод рабочых і сялян Заходняй Беларусі велізарную зацікаўленасьць.

Замест лёзанскай канфэрэнцыі нарада фінансавых экспэртаў

ПАРЫЖ, 19. Агенцтва Гавас паведамляе, што «ў сувязі з надыходзячымі выбарчымі кампаніямі ва Францыі, Германіі і ПАЗШ і немагчымасьці цяпер канчаткова вырашыць пытаньне аб рэпарацыях і даўгох, францускі і ангельскі ўрады, відавочна, прыйшлі да згоды аб аднаўленьні гувэраўскага мараторыя Германіі, тэрмін якога канчаецца 1-га ліпеня 1932 году аб прадаўжэньні яго на тых-жа ўмовах на 6 месяцаў ці на год. Разам з тым эўрапэйскія даўжнікі ПАЗШ павінны будуць патрабаваць для сябе ў ПАЗШ такога-ж рэжыму і такіх-жа ўмоў на ўвесь тэрмін новага мараторыя, прадастаўленага Германіі.

Калі дзяржавы, падпісаўшыя плян Юнга, змогуць дагаварыцца на гэтай плятформе, дык канфэрэнцыя ў Лёзане стане беспрадметнай. Даволі будзе арганізаваць нараду фінансавых экспэртаў, каб выпрацаваць неабходную згоду аб аднаўленьні сучаснага мараторыя».

Ажыцьцяўляем заветы Леніна

Рост пасеўнай плошчы сацыялістычнага сэктару с.-г. БССР.

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ЗА МЯЖОЮ

2-хтысячны мітынг у Глазго

ЛЕНДАН, 19. У Глазго адбыўся мітынг, прысьвечаны гадавіне сьмерці Леніна, Лібкнэхта і Р. Люксэмбург. У мітынгу прынялі ўдзел 2.000 рабочых. Прамовы прадстаўнікоў кампартыі т. т. Тома Мана і Ізабэлы Брэўн выклікалі велізарны энтузіязм сярод удзельнікаў мітынгу. 287 чал. заявілі аб уступленьні ў кампартыю.

***

ЛЕНДАН, 19. З 15-га па 31-га студзеня кампартыя праводзіць кампанію ў сувязі з гадавінай сьмерці Леніна, Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург пад лёзунгамі:

1. Узбраеньне партыі рэвалюцыйнай тэорыяй ленінізму для барацьбы за рэвалюцыйны выхад з крызісу, мабілізацыя рабочых вакол лёзунгу ангельскай кампартыі і Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Бязьлітасная барацьба супроць правых і «левых» ухілаў ад генэральнай лініі партыі.

2. Арганізацыя масавай кампартыі, узмацненьне масавай работы, работы на прадпрыемствах, надаўшы больш высокі ўзровень барацьбы за заваяваньне большасьці рабочай клясы, за канчатковы падрыў масавай базы рэфармізму ўнутры рабочай клясы.

3. Асьвятленьне дасягненьняў рабочай клясы СССР, якія зьяўляюцца лепшым помнікам Леніну, Карлу Лібкнэхту і Розе Люксэмбург.

«Дэйлі Уоркер» падкрэсьлівае выключна важнае значэньне, якое мае для ангельскага пралетарыяту вывучэньне Леніна аб калёніях. «Наша задача, — піша газэта, — пашыраць сярод ангельскіх рабочых рэвалюцыйнае вучэньне Леніна ў сувязі з неабходнасьцю сумеснай барацьбы ангельскіх рабочых і працоўных калёній, выступаючых супроць ангельскага імпэрыялізму».

«Дэйлі Уоркер» паказвае, што, адводзячы належнае рэвалюцыйным заслугам Розы Люксэмбург, неабходна рашуча адмяжавацца ад яе памылак, у прыватнасьці па нацыянальным пытаньні. (ТАСС).

ПАЛЯПШАЕЦЦА МАТАР'ЯЛЬНЫ ДАБРАБЫТ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ
Рост фонду зарплаты па СССР.

БРЫГАДА ПІСЬМЕНЬНІКАЎ У МЕНСКУ

20-га брыгада наведала Унівэрсытэцкі Гарадок, гутарыла з рэктарам БДУ тав. Ермаковым, знаёмілася з пастаноўкаю работы па падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў для пэдагагічнага і культурнага фронту.

Таксама адбылася вялікая сустрэча інтэрнацыянальнай брыгады і беларускіх пісьменьнікаў з работнікамі Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі.

На сустрэчы прысутнічала ўся інтэрнацыянальная брыгада, беларускія і яўрэйскія пісьменьнікі: Лынькоў, Рыгор Кобец, Харык, Броўка, Сымон Баранавых, Барашка, Янка Купала, Янка Маўр і шмат іш.

Магутны адпор гішпанскага пралетарыяту рэакцыі

У Сагунта рабочыя некалькі гадзін уладалі горадам

100-тысячная дэманстрацыя ў Більбао

МАДРЫД, 19. У Більбао пасьля мітынгу, склікаладага манархістамі і клерыкаламі, адбылася сутычка паміж манархістамі і рабочымі, забіты 4 рабочыя, паранены 3.

Гэта выклікала велізарнае абурэньне ўсёй рабочай масы. Манархісты прымушаны былі ўцякаць у цэнтр гораду, але рабочая маса хлынула туды і асадзіла квартал. Паліцыя з велізарнымі намаганьнямі стрымлівала рабочых. Рабочым удалося разбурыць рэдакцыі рэакцыйных газэт. Праходзіўшыя па вуліцы рабочыя былі абстраляны з манастыра. Некалькі чалавек было паранена. Рабочыя прабавалі падпаліць манастыр, але былі разагнаны жандармэрыяй.

У часе гэтых падзей ажыцьцявіўся адзіны фронт рабочых камуністаў, анарха-сындыкалістаў, сацыялістаў і беспартыйных. Пад націскам мас правадыры сацыял-фашысцкай партыі прымушаны былі абвясьціць усеагульную 24-гадзінную забастоўку. Забастоўка паралізавала ўсё жыцьцё ў горадзе.

На пахаваньні ахвяр рэакцыі прысутнічала 100 тыс. чал. Рабочыя ішлі з чырвонымі сьцягамі. Пахавальная працэсія вылілася ў магутную дэманстрацыю пад кіраўніцтвам камуністаў. Група дэманстрантаў у 2.000 чал., пад кіраўніцтвам камуністаў, вызваліла палітзьняволеных.

Паводле апошніх паведамленьняў у трох вёсках сяляне падпалілі цэрквы. У Сагунта (правінцыя Валенсія) абвешчана ўсеагульная забастоўка. Рабочыя выйшлі на вуліцу са зброяй у руках. Паводле весткі «Геральдо-дэ-Мадрыд» паўстаўшыя рабочыя на працягу некалькіх гадзін былі гаспадарамі гораду. У Сагунта накіраваны войскі, якія «аднавілі парадак». (ТАСС).

Паведамленьні

— Усім гаркомам і райкомам КП(б)Б. Аргінстр. ЦК КП(б)Б паведамляе, што 6-месячныя курсы райпартактыву пры ЦК КП(б)Б прыступілі да заняткаў з 16 студзеня і таму прапануецца ўсім гаркомам і райкомам К(П)б)Б, якія не даслалі вылучаных таварышоў, тэрмінова выслаць на курсы райпартактыву.

— Менгарсавет СВБ паведамляе слухачоў антырэлігійнага унівэрсытэту, што чарговыя заняткі адбудуцца 21-І 1932 г. у 7 гадз. веч., у памяшк. Унівэрсытэцкага гарадка, фізычны корпус. Яўка абавязкова.

ПАПРАЎКА.

У артыкуле тав. Лазоўскага «У барацьбе за збожжа», зьмешчаным у «Зьвяздзе» № 16(4268), у 6 калёнцы, 1-м абзацы ўкралася карэктарская памылка. Надрукавана: «па Арганскім раёне — 2,2 проц.», а патрэбна 9,2 проц.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Кіно СПАРТАК
ТОЛЬКІ два дні 21 і 22 студзеня
БРАНЯНОСЕЦ ПАЦЁМКІН
драма ў 5-ці частках
4 СЭАНСЫ:
Пачатак у 7 гадз., 8-15, 9-30 і 10-45.
КАСА—з 3 гадз.
З 23 студзеня
НІБЭЛУНГІ 1 серыя ў 12 частках.
КАСА—з 10 гадз. раніцы.
Пачатак у 7, 9 і 11 гадз.

ЦБ СНП
21 студзеня г. г., у 7 гадз. веч., у памяш. клюбу навуковых працаўнікоў (Камуністычная вул. № 13) адбудзецца
Пашыраная нарада
тарыфна-бытавога сэктару ЦБ СНП
з удзелам прадстаўнікоў НДІ і ВНУ па пытаньнях наменклатуры пасад і тарыфаў аплаты навуковых працаўнікоў. На нараду запрашаюцца прадстаўнікі ўсіх заклаўных навуковых устаноў і навуковыя працаўнікі г. Менску.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Каса—ад 1 г. дня	Гукавы гаворачы фільм СНАЙПЭР.
„Інтэрнацыянал"	Мастацкі фільм ХТО ТЫ ТАКІ? У гал. рол. КТОРАЎ і СУДАКЕВІЧ. КАСА—ад 1 гадз. дня.
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня	Мастацкі фільм ПАД УЛАДАЙ АДАТА Кіно-аповесьць у 7 частках.
„СПАРТАК" пачатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 11 г.	НІБЭЛУНГІ ў 2-х серыях 1-я серыя ў 12 частках. КАСА—з 1 гадз. дня.

26 студзеня Клюб ХАРЧАВІКОЎ
ВЯЛІКІ ВЕЧАР ТВОРЧАСЬЦІ НАРОДАЎ СССР
(з прычыны прыезду ў Менск інтэрнацыянальнай брыгады пісьменьнікаў).
Не вечары чытаюць свае творы: расійскія, украінскія, грузінскія, узбэцкія, беларускія, яўрэйскія і польскія пісьменьнікі.
Пачатак роўна ў 7 гадзін.

Сэкта прамкадраў ВСНГ БССР паведамляе, што
УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ШКОЛ ФЗВ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ВСНГ
скліваецца 27 студзеня 1932 г.
Рэгістрацыя дэлегатаў і выдача мандатаў пачнецца 26 студзеня г. г.
Сэктар Прамкадраў ВСНГ БССР.

21 студзеня роўна ў 5 гадз. вечара ў Дзяржтэатры
адбудзецца
ЖАЛОБНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ МЕНГАРСАВЕТУ
з удзелам партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый гораду
з дакладам „8 год бяз Леніна".
Члены і кандыдаты Гарсавету, дэлегаты партканфэрэнцыі, члены бюро ЦК КП(б)Б, члены прэзыдыуму ЦКК, ГарКК КП(б)Б, члены прэзыдыуму ЦСПСБ, ГСПС, члены ЦК ЛКСМБ праходзяць па сваіх мандатах. Рабочыя прадпрыемстваў па запрашальных білетах. Білеты выдаюцца Гарпрафсаветам 20-І-1932 г.
МЕНГАРСАВЕТ.

Выдавецтва „Власть Советов" пры прэзыдыуме УсеЦВК
АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1932 год
НА ЧАСОПІС
„РЕВОЛЮЦИЯ и НАЦИОНАЛЬНОСТИ"
Штомесячная часопіс Савету нацыянальнасьцяй Камуністычнай Акадэміі
12 НУМАРОЎ У ГОД. ГОД ВЫДАНЬНЯ 3-ці
„РЕВОЛЮЦИЯ и НАЦИОНАЛЬНОСТИ"
асьвятляе актуальныя пытаньні тэорыі і практыкі нацыянальнай палітыкі пад кутом погляду ўмацаваньня ленінізму ў нацыянальным пытаньні, змагаецца з усякімі ўхіламі ад лініі партыі ў нацыянальным пытаньні, трымае сваіх чытачоў у курсе вепоўных дырэктыў партыі і мерапрыемстваў савецкай улады па нацыянальным пытаньні, асьвятляе пытаньні рэканструкцыі народнай гаспадаркі ў нацыянальных раёнах, абласьцях і рэспубліках, аддае вялікую ўвагу праблеме кадраў, асьвятляе пытаньні партыйнага, савецкага і культурнага будаўніцтва нацыянальных раёнаў, абласьцей і рэспублік, дае матэрыялы аб жыцьці нацыянальных меншасьцяй у Саюзе ССР, асьвятляе нацыянальнае пытаньне і нацыянальны рэвалюцыйны рух за рубяжом, яго вядучых дзеячоў і цэнтральных і масовых арганізацый і ўстаноў у практычнай рабоце па вырашэньні нацыянальных пытаньняў і змяшчае сыстэматычныя агляды заканадаўства па нацыянальным пытаньні і бібліяграфіі. Журнал разьлічан на шырокія пласты партыі і савецкага актыву.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на год . . . 9 руб.
на 6 мес. . . . 5 руб.
на 3 мес. . . . 2 руб. 50 кап.
Асобны нумар . 1 руб.
Падпіску здавайце на пошце, або перавадзьце грошы па адрасе: Москва, ГСП, 5, Мясницкая, 21, изд-во ВЦИК „Власть Советов".

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

На рашаючых вучастках

ВУГАЛЬ. За 17 студзеня па Саюзе здабыта 198.630 тон вугалю. За 18 студзеня на Данбасе здабыта 141.571 тона вугалю.

ТРАКТАРЫ. 18 студзеня Сталінградзкі трактарны зьняў з канвэера 120 трактараў. Маскоўскі аўтазавод імя Сталіна (АМО) выпусьціў 35 аўтамашын.

МЭТАЛЬ. За 16 студзеня на мэталюргічных заводах Саюзу выплаўлена 15.247 тон чыгуну і 12.805 тон сталі (без малой мэталюргіі).

Будуецца новая фабрыка-кухня

ЛЕНІНГРАД. На заводу «Красный Путиловец» пачата будаўніцтва новай фабрыкі-кухні, разьлічанай на штодзенны выпуск 100 тыс. блюд. Фабрыка будзе адкрыта ў дні Кастрычніцкіх сьвят.

Пяцігодку за тры гады. Рапарт машынабудаўнічага заводу „Пралетары"

Бязьлітасна змагаючыся з усякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, асабліва з праваапартуністычнымі элемэнтамі, якія прабавалі сарваць бальшавіцкія тэмпы работы, рэалізуючы 6 умоў тав. Сталіна, дзякуючы вялікаму энтузіязму рабочых, Гомельскі машынабудаўнічы завод выканаў пяцігадовы плян за тры гады і 2 месяцы. Мы ня спынімся на гэтых посьпехах. Запэўняем ЦК КП(б)Б, што і ў далейшым, высока трымаючы пераходны сьцяг, мы будзем па-бальшавіцку змагацца за выкананьне пляну чацьвертага заключнага.

Трыкутнік заводу «Пралетары» КРАСНОЎ, ЛЯСТОЎ, РАМАНАЎ, РЫБАЛТОЎСКІ.

На добрускай папяровай фабрыцы

19 студзеня добруская папяровая фабрыка «Герой працы» выпусьціла паперы 258.680 клг. — 44,6 проц. сутачнага заданьня. Прастой машын складае 48 гадзін. Торфу падана 212 тон. Сілавая станцыя фабрыкі ў штурм яшчэ ня ўключылася.

Новыя радыёпрыёмнікі

Цэнтральная Ленінградзкая радыёлябараторыя сканструявала некалькі новых тыпаў радыёпрыёмнікаў — 4-х лямпавы аматарскі, які працуе сумесна з электрадынамічным гучнагаварыцелем, 3-лямпавы радыёвапчальны для калгасаў і 5-6-лямпавы для судоў савецкага гандлёвага флёту. Мадэлі радыёпрыёмнікаў перадаюцца прамысловасьці і лябараторыі для масавага вырабу.